Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
28 СТУДЗЕНЯ 2016 г. ЧАЦВЕР № 16 (28126) Кошт 2000 рублёў
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Таямніцы Крэўскага замка

СТАР. 5

Сямейная газета



Як зарабіць у дэкрэце?



Прыгоды мінчан... у вёсцы

*ЛІЧБА ДНЯ*

**9 млн 498,7 тысячы**

*чалавек склала колькасць насельніцтва краіны на 1 студзеня 2016 года, і ў параўнанні з пачаткам 2015-га павялічылася на 17 тыс. 873 чалавекі. Вызначальным фактарам павелічэння колькасці насельніцтва стаў міграцыйны прырост, які ў 2015-м склаў 18 тыс. 494 чалавекі. Асноўны міграцыйны абмен Беларусі адбываецца з краінамі СНД. Сярод выбыўшых пераважаюць асобы, якія выехалі ў краіны СНД. Іх доля ў агульнай колькасці тых, хто пакінуў нашу краіну, склала 67,8 працэнта. Колькасць шлюбаў у параўнанні з 2014 годам знізілася на 2,3 працэнта, колькасць разводаў — на 5,4 працэнта.*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 28.01.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 21365,00 | ▲ |
| Еўра | 23214,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 270,78 | ▲ |
| Укр. грыўня | 858,03 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# РАХМАНЫ ЗААПАРК



**Карына ФІЛЯНІНА, жыхарка вёскі Зарачаны Пухавіцкага раёна, марыць пра свой міні-заапарк, у якім будуць утрымлівацца свойскія птушкі і жывёлы. Васямнаццаць гадоў, як яна разам з мужам і сынам пакінулі сталіцу і заняліся сялянска-фермерскай гаспадаркай. На падворку гадуюцца да паўсотні трусоў, гусей і качак.**

**— У нашы Зарачаны часта прыязджаюць госці-турысты (тут ёсць аграсядзіба), многія з дзяцей ніколі не бачылі нават курэй, не кажучы пра індыкоў, індакачак, перапёлак, — кажа Карына. — Такі вясковы невялікі заапарк стварыць нам няцяжка — ён стане своеасаблівым цэнтрам пэт-тэрапіі для хворых дзяцей, якім неабходна знаёміца з навакольным светам.**

**Анатоль КЛЯШЧУК.**
**Фота аўтара.**

■ Сталічны час

## СУСТРЭНЕМСЯ ЛЯ МАНЮШКІ

### Што чакае Мінск у Год культуры?

**У краіне 2016 год абвешчаны Годам культуры. І сталіца ўжо гатовая ўваходзіць у яго — з канкрэтнымі прапановамі, ідэямі і праектамі. Пра тое, якія культурныя цікавінкі чакаюць мінчан сёлета, на прэс-канферэнцыі расказаў начальнік аддзела ўстаноў культуры і культурна-асветніцкай працы галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай працы, культуры і па справах моладзі Мінгарвыканкама Сяргей МЯДЗВЕДЗЕЎ.**

**КАПІТАЛЬНАЯ РЭКАНСТРУКЦЫЯ**

Які Год культуры без узвядзення новых і аднаўлення існуючых культурных аб'ектаў? І першымі сярод іх у спісе пазначаны не проста любімыя мінчанамі, а па-сапраўднаму культавыя месцы. Напрыклад, сёлета пачнуцца праектныя работы па рэканструкцыі Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра. Запланавана рэканструкцыя з рэстаўрацыяй кінатэатра «Перамога». У гэтым жа годзе пачнуцца работы па рэканструкцыі з капітальным рамонтам кінатэатра «Масква». Сталічныя ўлады абяцаюць завяршыць капітальны рамонт будынка Палаца культуры «Лошыцкі» ў Ленінскім раёне. Акрамя таго, нарэшце прадугледжваецца завяршыць работы па рэканструкцыі будынка былога маладзёжнага тэатра з прыбудовай і перапланіроўкай па вул. Машэрава, 33.

**КОНКАЙ — ДА МАРЦІНКЕВІЧА**

У самым сэрцы сталіцы, Верхнім горадзе, з'явяцца помнікі двум выдатным дзеячам: ураджэнцу Беларусі кампазітару Станіславу Манюшку і пісьменніку Вінцэнту Дуніну-Марцінкевічу. Апроч таго, у Год культуры ў горадзе пройдзе мноства мерапрыемстваў, прысвечаных юбілейным датам вядомых дзеячаў культуры і мастацтва.

СТАР. 4

■ Камунальныя стасункі

## ЗАПЛАЦІ ДОЎГ — АДДАЙ КВАТЭРУ

### Колькасць іскавых заяў, якія падалі на даўжнікоў камунальнікі Гомельшчыны, павялічылася летась удвая



**43-гадовую гамяльчанку, якая восем гадоў не аплачвала камунальныя паслугі за сваё жыллё, летась нарэшце выселілі з двухпакаёвай кватэры жылой плошчай 29,1 м па рашэнні суда Савецкага раёна. Яе асноўны доўг складаў больш за 7 млн рублёў, да таго ж назбіралася больш як 17 мільёнаў пені.**

**Грамадзянцы ўзамен прадаставілі кватэру жылой плошчай 10,9 метра. Жанчына вяла асацыяльны лад жыцця і была пазбаўлена правоў на выхаванне дваіх сваіх дзяцей — яны выхоўваюцца ў апякунскай сям'і. Дарэчы, на новым месцы жыхарства яна пражыла нядоўга і днямі памерла. Гісторыя сумная, але дастаткова тыповая.**

**Намеснік генеральнага дырэктара дзяржаўнага аб'яднання «Жылкамгас Гомельскай вобласці» Алег СПІРЫДОНАЎ адзначае, што за мінулы год па рашэннях судоў на Гомельшчыне было выселена 13 грамадзян. Усім ім знойдзена іншае жыллё. Зразумела, горшае за тое, што ў іх было.**

СТАР. 4

# НОВАЯ РЭДАКЦЫЯ ДЫРЭКТЫВЫ №3

**Дырэктыва Прэзідэнта Беларусі ад 14 чэрвеня 2007 года №3 «Эканомія і беражлівасць — галоўныя фактары эканамічнай бяспекі дзяржавы» прынята ў новай рэдакцыі. Адпаведны ўказ №26 падпісаў кіраўнік дзяржавы, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

Пры гэтым змяняецца назва дырэктывы: «Аб прыярытэтных напрамках умацавання эканамічнай бяспекі дзяржавы».

Для ўмацавання эканамічнай бяспекі дзяржавы ў Дырэктыве прадугледжваецца захады па павышэнні ролі і ўкладу навуковай супольнасці ў вырашэнне значных для дзяржавы задач, росце экспартнага патэнцыялу для забеспячэння знешняй збалансаванасці эканомікі і дыверсіфікацыі экспарту, кардынальным змяненні якасці кіравання прамысловым комплексам, забеспячэнні энергетычнай бяспекі і незалежнасці краіны. Савету Міністраў даручана ў трохмесячны тэрмін зацвердзіць план мерапрыемстваў па рэалізацыі палажэнняў Дырэктывы.

Персанальная адказнасць за выкананне дакумента ўскладаецца на прэм'ер-міністра, кіраўнікоў рэспубліканскіх органаў дзяржкіравання і іншых дзяржаўных арганізацый, падпарадкаваных ураду, аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама.

■ Парламенцкі дзённік

# ХУТКАЯ ДАПАМОГА ДЛЯ ЭКАНОМІКІ

## Дэпутаты гатовы падтрымаць законапраекты ў рэжыме «тэрмінова»

**Пра гэта паведаміў старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Генадзь ГРЫЦКЕВІЧ падчас пасяджэння Савета Палаты прадстаўнікоў, дзе абмяркоўваўся графік падрыхтоўкі пытанняў для разгляду на дзявятай сесіі.**

«Партфель заказаў» Палаты прадстаўнікоў на вясновую сесію ўжо змяшчае 42 законапраекты. З іх 14 плануецца для разгляду ў першым чытанні, 17 — у другім. У планах таксама тры ратыфікацыі міжнародных дагавораў і, натуральна, разгляд аб'ёмнага заканадаўчага акта ў сферы культуры — Кодэкса аб культуры.

— Тэматыка законапраектаў шматгранная, — адзначыў Генадзь Грыцкевіч, — яна закранае розныя сферы праваадносін. Мы плануем разгледзець міграцыйную палітыку, а таксама ўдасканаленне заканадаўства ў сферах судовай абароны, забеспячэння дзяржаўнай бяспекі, на парадку дня — кантроль за абарачэннем наркатычных сродкаў. У сацыяльнай сферы — пытанне занятасці насельніцтва, санітарна-эпідэміялагічнай службы, рыхтуецца да другога чытання доўгачаканы законапраект «Аб абыходжанні з жывёламі».

«Думаю, мы падтрымаем любыя законапраекты ў сферы, што тычыцца эканамічнага развіцця нашай краіны, — тое, што неабходна будзе прыняць тэрмінова», — падкрэсліў дэпутат.

Падчас пасяджэння Савета Палаты прадстаўнікоў абмяркоўвалася і міжнароднае парламенцкае супрацоўніцтва. **Віталь БУСЬКО, старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах,** паведаміў, што план міжпарламенцкага міжнароднага супрацоўніцтва складаецца з чатырох раздзелаў.

— Першы — гэта ўдзел дэпутатаў у міжнародных міжпарламенцкіх арганізацыях: супрацоўніцтва ў рамках парламента Беларусі і Расіі, праца на пляцоўках Міжпарламенцкай асамблеі СНД, Міжпарламенцкай асамблеі АДКБ, — пералічыў дэпутат. — Гэта традыцыйныя напрамкі. Паралельна мы працягваем працу і на іншых кірунках, у першую чаргу — у Міжпарламенцкім саюзе, туды ўваходзяць літаральна ўсе парламенты свету. Гэта добрая пляцоўка, дзе кожнай дэлегацыі прадастаўляецца права выступіць на пленарным пасяджэнні. Парламенцкая асамблея АБСЕ ў сувязі з паляпшэннем у апошні час стасункаў Беларусі з Еўропай набывае асаблівае значэнне. У лютым туды паедзе наша дэлегацыя — у Вене будзе праходзіць чарговая сесія, дзе зноў жа мы будзем выказваць сваю пазіцыю. Мы спадзяёмся вярнуць Нацыянальнаму сходу Беларусі статус спецыяльна запрошанага ў Парламенцкай асамблеі Савета Еўропы. Літаральна на днях адбыліся выбары старшыні гэтай арганізацыі, ім стаў прадстаўнік Іспаніі. У сваім выступленні пры абранні ён асобна сказаў пра вяртанне нашай краіне вышэйназванага статусу.

Далейшае развіццё, па словах старшыні камісіі па міжнародных справах, будзе атрымліваць наладжванне стасункаў з краінамі так званай «далёкай дугі».

— Перш за ўсё гэта МПА АСЕАН, дзе ў нас вельмі добрыя стасункі, і сёлета мы плануем візіты ў Тайланд і Інданезію. Да нас збіраецца прыехаць старшыня парламента В'етнама, прадстаўнікі іншых краін гэтага рэгіёна.

Сярод іншых кірункаў міжнароднай працы нашага парламента — двухбаковае супрацоўніцтва, удзел у назіранні за выбарамі, рэферэндумамі, а таксама ў іншых парламенцкіх мерапрыемствах.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

# СКАЛІСТЫ ШЛЯХ ДА ТУРКМЕНІСТАНА

**Пасля паступовага пад'ёму тавараабарот паміж Беларуссю і Туркменістанам пачаў спускацца ўніз. Летась узаемны гандаль паміж нашымі краінамі скараціўся амаль у 2 разы. Занепакоенасць у гэтым падчас працоўнай нарады выказаў Міхаіл МЯСНІКОВІЧ, старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі.**

— Стан спраў не вытрымлівае аніякай крытыкі, — лічыць ён. — Не трэба казаць пра тое, як цяжка і няпроста. Проста не было ніколі. Мы з Анатолем Калініным прынялі рашэнне інфармаваць кіраўніка дзяржавы аб магчымай немэтазгоднасці знаходжання асобных службовых асоб на займаных пасадах за бяздзейнасць або неэфектыўную працу. Час угавораў прайшоў. Падзенне аб'ёмаў тавараабароту — у 2 разы. Нягледзячы на тое, што на палітычным узроўні, на ўзроўні кіраўніка дзяржавы зроблена ўсё.

На думку спікера верхняй палаты беларускага парламента, у асобных кампаній і міністэрстваў атрымалася павысіць паказчыкі. «Але некаторыя ва ўпор не жадаюць працаваць. Хтосьці кажа, што гэта ментальнасць. Гэта не ментальнасць, а бесхрыбетнасць і безадказнасць», — лічыць парламентарый.

— На жаль, экспарт тавараў склаў 193,5 мільёнаў долараў супраць 256 мільёнаў у 2014 годзе, — заўважыў **намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Анатоль КАЛІНІН**. — Экспарт паслуг павялічыўся на 44%, а па таварах, адпаведна, знізіўся. Пры гэтым наменклатура экспарту ў Туркменістан пашырылася на 83 таварныя пазіцыі. Разам з тым таварная дыверсіфікацыя экспарту не папаўняе страты, допушчаныя найбуйнейшымі экспарцёрамі — Міністэрствам прамысловасці і Міністэрствам архітэктуры і будаўніцтва. У снежні—лістападзе 2015 года іх тавараабарот паменшыўся на 55,3%.

Пры гэтым віцэ-прэм'ер адзначыў, што ў тавараабароце склалася станоўчае сальда, але гэта не павінна нас суцяшаць або радаваць. Тое, што эканамічная сітуацыя Туркменістана пагоршылася з прычыны падзення сусветных цэн на вуглевадародную сыравіну і дэвальвацыі, не можа апраўдаць падзенне беларускага экспарту па цэлым шэрагу таварных пазіцый. «Больш паспяховыя вынікі ў канцэрна «Беллегпрам», экспарт якога павялічыўся ў 1,6 раза і склаў 540 тысяч долараў. А таксама Міністэрства аховы здароўя, экспарт якога павялічыўся ў паўтара раза і склаў 2 мільёны долараў. Усімі астатнімі праца фактычна праваленая», — лічыць ён.

Асобна намеснік прэм'ер-міністра звярнуў увагу на працу беларускіх будаўнікоў у Туркменістане. Ён згадаў, што нядаўна Прэзідэнт Туркменістана Гурбангулы Бердымухамедаў у прысутнасці Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі выказаў прапанову прыцягваць да працы беларускіх будаўнікоў пасля заканчэння работ на Гарлыкскім горна-абагачальным камбінаце на іншыя аб'екты Туркменістана. Намеснік прэм'ер-міністра задаецца лагічным пытаннем: «У першым паўгоддзі 2016-га там чакаецца заканчэнне ўсіх будаўнічых работ. Што будзем далей рабіць?»

Анатоль Калінін дадае, што ў 2016 годзе Туркменістан плануе накіраваць 7 мільярдаў долараў інвестыцый на будаўніцтва аб'ектаў вытворчага і сацыяльнага значэння. Усяго за 5 гадоў плануецца ўкласці 35 мільярдаў. На яго думку, акрамя Мінбудархітэктуры, на гэты рынак мусяць выйсці і беларускія энергетыкі. «Пакуль не бачу іх зацікаўленасці», — дадаў віцэ-прэм'ер.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

■ Блізкая ўлада

# ХОЧАШ ВОРАГА НАЖЫЦЬ, ДЫК ГРОШЫ ПАЗЫЧ

**Пенсіянерка з Вілейкі жыла з суседзямі ў міры і згодзе. Выручала, калі трэба было, грашыма. Сумы, канешне, невялікія, але ўсё ж... Ды і вярталі пазыку ёй своечасова. Так было да пары да часу. Жанчына адной з першых на сваёй вуліцы правяла ў дом газ. А затым і суседзі пачалі прасіць у яе дазволу падключыцца да сетак. І яна пагадзілася. Але даверлівасць і жаданне быць для ўсіх добрай выйшла ёй бокам. Адзін з суседзяў разлічыўся толькі праз чатыры месяцы. Другая сям'я абяцала аддаць доўг да ліпеня мінулага года, а цяпер наогул робіць выгляд, што нікому нічога не павінна. А для былой медыцынскай сястры больш, як 3 млн рублёў — немалая сума.**

Такую гісторыю расказала жанчына падчас выязнога прыёму грамадзян **старшынёй Мінаблвыканкама Сямёнам ШАПІРАМ** у Вілейскім раёне.

Валянціна Аляксандраўна звярталася ў райвыканкам, райгаз, да мясцовага дэпутата, каб, вобразна кажучы, націснулі на яе суседку, але ўсё дарэмна. Таму спадзяванні яна ўскладае на кіраўніка вобласці, які, на яе думку, павінен вырашыць спрэчнае пытанне па справядлівасці.

Як правіла, рашэнне аб падключэнні спажыўцоў да інжынерных камунікацый прымае райвыканкам. У гэтым выпадку грамадзяне самі дамовіліся паміж сабой. Улады не маюць дачынення да гэтай справы і не могуць прымусіць іх разлічыцца з крэдытарам.

Жанчына звярнулася з іскавай заявай у суд, пасяджэнні якога яшчэ працягваюцца. «Вы на правільным шляху, толькі суд можа вам дапамагчы, дачакайцеся яго рашэння, — параіў пенсіянерцы Сямён Шапіра.

З пытаннямі, якія можа вырашыць толькі суд, да Сямёна Шапіры звярталіся і іншыя грамадзяне. У прыватнасці, адзін з жыхароў Вілейкі займаў пасаду інструктара ў раённым аддзеле адукацыі. Па заканчэнні тэрміну кантракта з ім не прадоўжылі працоўныя адносіны. Паводле працоўнага заканадаўства наймальнік мае права зрабіць гэта ў аднабаковым парадку без тлумачэння прычын. Суд падтрымаў наймальніка, але вынес прыватнае вызначэнне, дзе ўказаў яму на недахопы. У прыватнасці, адсутнічалі падставы для пераводу работніка на кантракт, паколькі не былі ўстаноўлены меры дадатковага стымулявання за пагаршэнне яго прававога становішча. Але мужчыну гэта не спыніла: змаганне працягваецца...

Старшыня аблвыканкама звярнуў увагу заяўнікаў на немэтазгоднасць такіх зваротаў і параіў чакаць рашэння суда.

Задаволены вынікамі прыёму застаўся Аляксандр Дудко. Ён працуе ў леспрамгасе, жыве ў інтэрнаце. Мужчына хацеў бы прыватызаваць жылплошчу. Яму растлумачылі, што такая магчымасць прадугледжана Указам Прэзідэнта №560. Але арганізацыя, якой належыць будынак, збанкрутавалася. Пасля таго, як будуць аформлены праваўстаноўчыя дакументы, інтэрнат пяройдзе ў камунальную ўласнасць. Райвыканкам прыме адпаведнае рашэнне, і ён зможа стаць уласнікам жаданых квадратных метраў. Сямён Шапіра паабяцаў мужчыну: «Мы вам дапаможам і пракантралюем пытанне».

Жыхаркі вёскі Карповічы паскардзіліся, што ў іх вёску не заўсёды заходзяць рэйсавыя аўтобусы: дрэнная дарога. Прычына, на іх погляд, яшчэ і ў тым, што ў адрозненне ад прыватных маршрутак яны часта не запаўняюцца. Сямён Шапіра даручыў ААТ «Мінаблтранс» і камітэту эканомікі Мінаблвыканкама прааналізаваць сітуацыю. «Калі перавозкі маршрутнымі таксі прыбытковыя, а аўтобусныя стратныя, трэба пераразмеркаваць маршруты. Хочаш вазіць, дзе ў цябе будзе поўны камплект, калі ласка, але трэба ездзіць і там, дзе гэта не вельмі выгадна, там, дзе працуюць дзяржаўныя перавозчыкі». Акрамя таго, ён даручыў старшыні райвыканкама больш увагі надаваць стану дарогі.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.** *lazovskaya@zviazda.by*

## «ГАРАЧЫЯ» ТЭЛЕФОНЫ

Са студзеня 2015 года па суботах у нашай краіне арганізавана штотыднёвае правядзенне аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам прамых тэлефонных ліній. Яны праводзяцца ў мэтах павышэння эфектыўнасці работы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб, выкаранення фактаў бюракратызму і цяганіны, а таксама для аператыўнага вырашэння праблемных пытанняў, якія ўзнікаюць у людзей.

Праблемы хоць і да гэтага часу ёсць, аднак у асноўным яны носяць лакальны характар і вырашаюцца за кароткі тэрмін.

**У гэтую суботу, 30 студзеня, з 9.00 да 12.00 на сувязь з жыхарамі краіны выйдуць:**

**Брэсцкі аблвыканкам**
намеснік старшыні ЦУПРЫК Леанід Аляксандравіч (80162213121);

**Віцебскі аблвыканкам**
намеснік старшыні абласнога Савета дэпутатаў ХРЫСТАФОРАЎ Аляксандр Мікалаевіч (80212222222);

**Гомельскі аблвыканкам**
кіраўнік справамі КЛІЧКОЎСКАЯ Алена Уладзіміраўна (80232751237);

**Гродзенскі аблвыканкам**
намеснік старшыні ШУЛЕЙКА Юрый Вітольдавіч (80152735644);

**Мінскі аблвыканкам**
першы намеснік старшыні МАКАР Ігар Мікалаевіч (80175004160);

**Магілёўскі аблвыканкам**
намеснік старшыні НЕКРАШЭВІЧ Віктар Уладзіміравіч (80222501869);

**Мінскі гарвыканкам**
намеснік старшыні БІРЫЧ Жанна Эдуардаўна (80172224444).

■ Стыхія

# НАЛЕДЗЬ МОЦНА НЕ НАШКОДЗІЛА



**Здаецца, яшчэ зусім нядаўна мы ўсім светам змагаліся з сумётамі, нанесенымі двума запар цыклонамі, а ў аўторак вечарам (прынамсі мінчан) ачышчаныя ад снегу месцы сустрэлі суцэльнай коўзанкай. І ўсё з-за ледзяного дажджу.**

Паводле інфармацыі «Белэнерга», на шчасце, працяглых адключэнняў электрычнасці ў населеных пунктах на гэты раз не было. Цягам сутак з-за наледзі на галінах, якая прыводзіла ў выніку да падзення дрэў на лініі электраперадач, такія выпадкі фіксаваліся, аднак сітуацыя аператыўна выпраўлялася. Парушэнні электразабеспячэння з-за падзення дрэў назіраліся пераважна ў Слуцкім, Старадарожскім, Любанскім і Бабруйскім раёнах. На ранак серады былі зафіксаваны 23 адключэння ад электразабеспячэння населеныя пункты ў Мінскай вобласці, з іх 20 — з насельніцтвам менш за 50 чалавек.

Нагадаем, што падчас нядаўніх снегападаў работы па расчыстцы ліній электраперадач вялі больш як 500 чалавек толькі з ліку работнікаў дзяржаўнай лясной аховы. Тады асноўны ўдар стыхіі прыпаў на Старадарожскі раён, значныя наступствы яна пакінула пасля сябе і ў Асіповіцкім, Бабруйскім і Глускім раёнах.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■ Што ў выніку?

# ЯШЧЭ БОЛЬШ ДАСТУПНАСЦІ

**Найбольш важныя факты, агучаныя на выніковай калегіі Міністэрства аховы здароўя, датычацца нараджальнасці, камп'ютарызацыі і кадраў.**



### РЭКОРД НАРАДЖАЛЬНАСЦІ

Мінулы год аказаўся багатым на немаўлят — на свет з'явіліся 119 506 дзяцей. Сапраўдны рэкорд. Гэта нават больш, чым у самым паспяховым за апошнія дваццаць гадоў 2014-м, калі нарадзіліся 118,5 тысячы немаўлят, адзначыла на выніковай калегіі Міністэрства аховы здароўя **намеснік прэм'ер-міністра Наталля КАЧАНАВА**. Выпадкаў мацярынскай смяротнасці летась не зарэгістравана. Каэфіцыент нараджальнасці з 2011-га па 2015 год вырас амаль на 10 працэнтаў. Мэтанакіраваная работа арганізацый аховы здароўя дазваляе гаварыць сёння аб магчымасці догляду новаароджаных вагой 500-1000 г — выжывальнасць такіх дзетак у перынатальных цэнтрах складае 82 працэнты. Дапаможныя рэпрадуктыўныя тэхналогіі дазволілі нарадзіцца ў 2011-2015 гадах больш як 1,6 тысячы дзяцей, эфектыўнасць такой тэхналогіі складае 40 працэнтаў, паведамляе БЕЛТА.

### МЕДКАРТКА Ў КАМП'ЮТАРЫ

Як адзначыў падчас калегіі **міністр аховы здароўя Васіль ЖАРКО**, сёлета па ўсёй краіне плануецца ўкараніць тэхналогію электроннага рэцэпта, паспяхова апрабіраваную летась. А налета «ў нас павінна быць электронная медыцынская картка як аснова інтэграцыі аховы здароўя». Апошняя дазволіць палепшыць агульную колькасць медыка-санітарнага абслугоўвання, скароціць аб'ём папяровай работы. Электронная дакументацыя будзе назапашваць інфармацыю аб пацыенце цягам усяго жыцця: звесткі аб клінічных наз іраннях, лячэнні, вакцынацыі, прызначаных леках, алергічных рэакцыях, выніках даследаванняў і іншае.

### КАБ НЕ ЕХАЦЬ У ВОБЛАСЦЬ

У 2016 годзе ўсе раёны павінны быць укамплектаваны вузкімі спецыялістамі. Пры іх адсутнасці намеснікі галоўных урачоў і загадчыкі адпаведных аддзяленняў павінны спалучаць кіруючую і вакантную пасады.

Міністр адзначыў, што практыку накіравання пацыентаў у абласныя гарады неабходна спыняць, галоўнае — забяспечыць насельніцтву даступнасць і якасць медыцынскай дапамогі на месцах. Наогул, у галіне працуюць прафесійныя кадры, падкрэслівае Васіль Жарко, аднак беларускія спецыялісты павінны больш актыўна пераймаць замежны вопыт для павышэння сваёй кваліфікацыі.

■ Гістарычная падзея

# Палярнікі, з улазінамі!

**Першы аб'ект Беларускай антарктычнай станцыі ўстанавілі нашы палярнікі.**

Пра тое, што асабісты склад VIII Беларускай антарктычнай экспедыцыі скончыў праявядзенне інжынерна-тэхнічных мерапрыемстваў па ўводзе першага аб'екта станцыі ў эксплуатацыю і прыступіў да выканання праграмы навуковых даследаванняў, паведаміў **начальнік БАЭ Аляксей ГАЙДАШОЎ**. Цяпер Беларусь мае на шостым кантыненце паўнавартасны трохсекцыйны спецыялізаваны лабараторна-жылы модуль, які знаходзіцца там жа, дзе і папярэдняе, часовае «жыллё» палярнікаў — у раёне гары Вячэрняй ва Усходняй Антарктыдзе. А гэта значыць, што магчымасці нашай краіны па вывучэнні Антарктыкі значна павялічацца.

Сімвалічна, што падзея адбылася напярэдадні Дня беларускай навукі. Начальнік экспедыцыі перадаў свае віншаванні калектыву НАН і ўсім работнікам навукі ў краіне. «Абавязкова трэба ўспомніць тых, хто заклаў падмурак гэтых поспехаў і гэтага пачынання, — гаворыцца ў паведамленні Аляксея Гайдашова. — Гэта і ветэраны-палярнікі, якія працавалі ў складзе савецкіх антарктычных экспедыцый, і шырокая навуковая грамадскасць нашай краіны. Гэта дзясяткі, сотні спецыялістаў розных міністэрстваў і ведамстваў, якія маюць да падзеі прамое дачыненне. Яна стала магчымай у многім дзякуючы таму, што праводзіцца мэтанакіраваная дзяржаўная палітыка ў гэтым кірунку. І словы «Зроблена ў Беларусі» ў гэтым выпадку ўсе мы разам з вамі можам прамаўляць з гонарам».

Нагадаем, што ў складзе VIII Беларускай антарктычнай экспедыцыі працуюць пяцёра беларускіх палярнікаў: начальнік экспедыцыі Аляксей Гайдашоў, інжынер-радыяметрыст Максім Гарбацэвіч, майстар па эксплуатацыі і рамонце машын і механізмаў Аляксей Захватаў, хірург Леанід Нікіцюк і гідраметназіральнік Сяргей Торбік. Галоўнай мэтай БАЭ, якая распачалася ў мінулым кастрычніку, быў якраз мантаж Беларускай антарктычнай станцыі, распачаванай і сабранай на адным з айчынных прадпрыемстваў.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*



■ Адзнака

# ЧАРГОВЫЯ ПРЫЗЫ Ў СКАРБОНЦЫ «ЗВЯЗДЫ»

**На пачатку года нашы журналісты працягваюць збіраць прафесійныя ўзнагароды. Вось і ўчарашні дзень зноў не абышоўся без прызнання высокага ўзроўню супрацоўнікаў «Звязды». Гэтым разам своеасаблівым дуплетам «выстралілі» суджэнцы: рэдактар аддзела навін і рэпартажаў Сяргей Расолька і рэдактар аддзела адукацыі Надзея Нікалаева.**


Фота Надзеі БУЖАН.

Моцнай палове сям'і дасталася перамога ў намінацыі «Апературыўнасць і аб'ектыўнасць» творчага конкурсу на найлепшае асвятленне дзейнасці Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. Адзначым, што ўзнагароду Дзяржінспекцыі Сяргей Расолька атрымлівае ўжо другі год запар — зайздросная стабільнасць!

А ў Надзеі Нікалаевай адзнака ўжо другая ў гэтым месяцы! Зусім нядаўна наша калега атрымала дыплом пераможцы за асвятленне дзейнасці Нацыянальнай акадэміі навук, і вось чарговая падзяка: ад Цэнтральнага камітэта Беларускага прафесійнага саюза работнікаў адукацыі і навукі. Журналістку «Звязды» адзначылі за інфармацыйную падтрымку прафсаюза, прафесіянальную падачу матэрыялаў, арганізацыю грамадскіх дыскусій і дзейсную падтрымку педагагічнай супольнасці краіны.

Калегі па рэдакцыі далучаюцца да віншаванняў і зычаць пераможцам няспыннага натхнення і новых прафесійных узнагарод!.

## АДКУЛЬ ДЗІЧЫНА НА КУХНІ?

У кар'еры пад Заслаўем дзяржінспектары знайшлі чатыры мяхі з рэштамі двух дзікоў. Шкуры былі прастрэленыя кулямі. Каб разабрацца ў сітуацыі, рэйдавая група накіравалася ў бліжэйшую вёску Кіршы. Адзін з яе жыхароў мог мець дачыненне да незаконнага палявання. І інтуіцыя дзяржінспектараў не падвяла. На падворку ў падазраванага знайшлі кроў і шэрсць дзікай жывёлы, а таксама 200 кілаграмаў дзічыны. Яго паходжанне гаспадар патлумачыць не змог. Сам мужчына — паляўнічы і мае тры зарэгістраваныя стрэльбы. Зброя канфіскавана, прызначаны шэраг экспертыз.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# КУБАК ГАГАРЫНА Ў МІНСКУ

**За сваю гісторыю мінскае «Дынама» ў Кантынентальнай хакейнай лізе да фіналу так і не дайшло, у прысёрах не хадзіла, але Кубак Гагарына, галоўны трафей турніру, названы ў гонар славутага касманаўта, у Мінск усё ж такі прыехаў — для балельшчыкаў.**

Заўзятараў у гандлёвым цэнтры «Замак», дзе часова, літаральна на два дні, выставілі галоўную хакейную рэліквію Усходняй Еўропы, хапала. І кожны хацеў сфатаграфавацца, дакрануцца да 19-кілаграмовага сярэбранага кубка, нягледзячы на тое, што яго ад прысутных абараняла шкляная заслона.

Прэзентаваць узнагароду ў сталіцы Беларусі атрымалася дзякуючы кампаніі «Балтыка», якая з'яўляецца партнёрам Кантынентальнай хакейнай лігі.

— Галоўны трафей КХЛ — узнагарода, якую цікава ўбачыць кожнаму аматару хакея, — кажа **Ганна ГУБКІНА, прадстаўніца брэнда «Балтыка» ў нашай краіне**. — Наша кампанія пастаянна падтрымлівае розныя спартыўныя пачынанні. І такія падзеі, як гэтая, ствараюць эмацыйны фон, які падтрымлівае каманду. Нашаму брэнду, які актыўна прапагандуе хакей, асабліва прыемна прадставіць рэліквію КХЛ у Мінску, дзе хакей — культавая гульня.

— Памеры і знешні выгляд уражваюць, — прызнаецца **Юлія ГАНЧАР, лідарка фан-руху мінскага «Дынама»**. — Калі бачыш яго ўжывую, яшчэ больш хочацца, каб узнагарода не толькі прыехала ў госці, але і дасталася нашай камандзе.

Што цікава, адзіным беларусам — уладальнікам Кубка Гагарына з'яўляецца Канстанцін Кальцоў. Цяпер ён выступае за сталічнае «Дынама», а ў 2011 годзе заваяваў трафей разам з уфімскім «Салаватам Юлаевым». Канстанцін таксама далучыўся да акцыі і нават падпісаў клюшку пераможцу адмысловай віктарыны.

**Якаў ЖУРБІН.**


Фота Надзеі БУЖАН.

■ Ну і ну!

# КАХАННЕ І... МЯЖА

**Мясцовыя жыхары паведамілі смаргонскім пагранічнікам, што ў бок дзяржаўнай мяжы рухаецца невядомы.**

Для праверкі гэтай інфармацыі тут жа накіраваўся пагранічны нарад, які за тры кіламетры ад беларуска-літоўскай мяжы, у раёне вёскі Куляшы, затрымаў грамадзяніна Расійскай Федэрацыі 1998 г.н. Жыхар Новасібірскай вобласці паведаміў, што збіраўся незаконна перайсці яе для таго, каб сустрэцца з каханай у Літве. Маладога чалавека афармілі парушальнікам дзяржаўнай мяжы і змясцілі ў ізалятар часовага ўтрымання Смаргонскай пагранічнай групы.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ОАО «БАТЭ» – управляющая компания холдинга «Автокомпоненты», г. Борисов, ул. Даумана, 95** |
| **Предмет аукциона** | |
| **Наименование (модель)** | **Месторасположение** |
| Машина холодной высадки 1500 – GGF. Производитель – KAYSER (Нюрнберг, Германия). Год производства – 1973. Инвентарный номер – 09100360. Заводской номер – 43757 | г. Борисов, ул. Даумана, 95 |
| **Область применения** | Машина предназначена для холодной высадки заготовок. Холодная высадка — операция холодной объемной штамповки — получение деталей (заготовок) с местными утолщениями путем уменьшения длины части заготовки без нагрева металла, основная операция получения деталей типа болтов, винтов, заклепок |
| **Дополнительная информация** | Машина технически исправна, в рабочем состоянии, комплектна (реализуется без технологической оснастки). Номинальное усилие – 1500 т |
| **Условие демонтажа и самовывоза** | Демонтаж, разборка, погрузка и транспортировка предмета аукциона, соблюдение таможенных процедур и формальностей проводится за счет покупателя. Демонтаж и вывоз предмета аукциона, а также последующее восстановление стен здания цеха после демонтажа предмета аукциона, производится за счет покупателя в течение 10 календарных дней после подписания акта приема-передачи предмета аукциона |
| **Начальная цена предмета аукциона с НДС 20% – 83 423 доллара США (USD)** | |
| Оплата за предмет аукциона производится резидентами РБ в белорусских рублях по курсу Нацбанка РБ на дату платежа; нерезидентами РБ в иностранной валюте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа, в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи | |
| **Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (BYR) перечисляется на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в евро (EUR) – 3012343265060; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки» | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **5 (пять)** рабочих дней после проведения аукциона |
| **Условия оплаты предмета аукциона** | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) дней** после заключения договора купли-продажи | |
| Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by** | |
| **Дата и время проведения аукциона** | **14.03.2016 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **11.03.2016 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-183-69-71. E-mail: auction@cpo.by. Сайт: www.cpo.by** |

■ «Настаўніцкай газеце» — 70

Вадзім КНЫШАЎ:

# «МЫ НЕ ПАБОЧНЫЯ НАЗІРАЛЬНІКІ І НЕ БЕЗУВАЖНЫЯ КРЫТЫКІ»

**Вось ужо 70 гадоў поруч з педагогамі крочыць «Настаўніцкая газета». Яна радок за радком, як летапісец, «нанізвае» час на газетныя палосы, ствараючы шматтомную гісторыю адукацыі краіны. Гартаючы старыя падшыўкі, бачыш на яе старонках выступленні аўтарытэтных педагогаў і экспертаў, чые развагі цікава чытаць і праз многія гады. Невыпадкова ў сем'ях, якія налічваюць ужо не адно пакаленне педагогаў, акуратна захоўваюцца папкі з пажаўцелымі выразкамі са старых газет, дзе падкрэслены алоўкам самыя цікавыя думкі. Днямі павіншаваць калектыў «Настаўніцкай» з 70-гадовым юбілеем сабраліся тыя, хто лічыць сябе адданым сябрам газеты: педагогі, якія станавіліся героямі журналісцкіх артыкулаў і якія самі цяпер сталі актыўнымі яе аўтарамі; кіраўнікі ўпраўленняў адукацыі, навучальных устаноў, Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта; кіраўнікі міністэрства адукацыі і інфармацыі; прадстаўнікі навуковай педагагічнай супольнасці, дэпутаты.**




— Ёсць такія цудоўныя выразы, як «родны кут», «родная школа», «родны інстытут», «родная хата». І ў гэты ж шэраг хочацца паставіць і такі выраз, як «родная газета». Я, вядома, маю на ўвазе нашу «Настаўніцкую газету», — дзеліцца сваімі думкамі **старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, культуры і навуцы Аляксандр СЯГОДНІК**. — Выданне прадстаўляе цэлую галіну. А што такое наша галіна? З ёй звязана кожная беларуская сям'я, кожны беларус. Значыць, і «Настаўніцкую газету» можна лічыць народнай газетай.

**Старшыня Камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама Міхаіл МІРОНЧЫК** прызнаўся, што кожны дзень у яго пачынаецца з «Настаўніцкай», а калі цягам дня ён не паспявае яе прагледзець, то абавязкова нясе дамоў, каб пачытаць у спакойнай абстаноўцы.

**«Для журналістаў «Настаўніцкай газеты» абсалютна натуральная рэч — шчыра радавацца стасункам з педагогамі і гэтак жа шчыра абурацца, убачыўшы, як прыніжаюць настаўніка».**

— Існаванне сваёй уласнай газеты ў педагогаў — фенаменальная з'ява для замежнікаў, таму нам ёсць чым ганарыцца, — падкрэслівае **прафесар, доктар філалагічных навук, загадчык кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання Інстытута журналістыкі БДУ Віктар ІЎЧАНКАЎ**. — Фенаменальнасць «Настаўніцкай газеты» заключаецца яшчэ і ў тым, што калі сюды прыходзіць працаваць настаўнік, ён павінен стаць журналістам. А калі прыходзіць журналіст, ён павінен стаць настаўнікам. Мы з задавальненнем адпраўляем на практыку нашых студэнтаў, бо газета з'яўляецца добрай пляцоўкай для журналісцкага станаўлення і росквіту.

**Дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Мікалай ФЯСЬКОЎ** упэўнены, што праект «Адукацыйная прастора», які ўяўляе сабой тэматычныя выпускі, прысвечаныя кожнай вобласці, значна пашырыў як тэматыку публікацый, так і кола чытачоў з ліку кіраўнікоў рознага ўзроўню сістэмы адукацыі. Гэта не толькі ўдалы маркетынгавы прыём (хто ж не захоча чытаць матэрыял пра свае падведамасныя ўстановы адукацыі?), але і матывацыя да з'яўлення новых творчых распрацовак ва ўстановах адукацыі.

— «Настаўніцкая газета» ніколі не апускаецца да скажэння фактаў, не робіць паспешлівых і недарэчных высноў і кожную навіну падае з веданнем справы. З-за пашырэння крыніц інфармацыі перыядычны друк вымушаны шукаць нейкія перавагі перад больш шпаркімі інтэрнэтам і тэлебачаннем. Але супрацоўнікі «Настаўніцкай газеты» нават нататкі з традыцыйнага ўрока падаюць як рэпартаж з конкурсу эрудытаў на званне лаўрэата года, — падкрэслівае Мікалай Фяськоў.

Крыху больш як год таму члены клуба «Хрустальны журавель» і рэдакцыя «Настаўніцкай газеты» стварылі новы дадатак «Форум», які стаў трыбунай для неабыякавых педагогаў: яны дзеляцца на яго старонках сваімі думкамі і ўзнімаюць найбольш актуальныя для ўсёй галіны праблемы і тэмы.

— З'яўляючыся настаўнікамі, мы пішам кожны дзень: на дошцы, у планах, канспектах, у дзённіках, але рабіць гэта так яскрава, як журналісты, мы, зразумела, не ўмеем. Але і вы не ведаеце працы педагога, таму ўзаемадзеянне ўзбагачае нас, — кажа **настаўнік-метадыст, выкладчыца біялогіі і хіміі Лугаваслабадской сярэдняй школы Мінскага раёна Алена ГАРБАР**. — Я звычайная сельская настаўніца, таму, прызнацца, вельмі ўзрадавалася магчымасці стаць удзельніцай такога форуму, бо не заўсёды звычайнаму педагогу выпадае сказаць тое, што ён адчувае... А пасля публікацыі прыемна пачуць водгукі сваіх калег, якія не проста прачыталі твой артыкул, а селі і напісалі свой. Каштоўнасць газеты ў тым, пра што яна гаворыць...

— Мы не ведамаснае выданне, — падкрэслівае **галоўны рэдактар «Настаўніцкай газеты» Вадзім КНЫШАЎ**. — Мы — выданне галіновае, паколькі працуем для ўсёй галіны. І разам з ёй дзелім радасці, а калі лёс распараджаецца інакш, то перажываем і паражэнні. Мы працуем для педагогаў, разам з педагогамі і не ўяўляем сябе па-за сістэмай адукацыі. Мы не пабочныя назіральнікі і не безуважныя крытыкі. Для журналістаў «Настаўніцкай газеты» абсалютна натуральная рэч — шчыра радавацца стасункам з педагогамі і гэтак жа шчыра абурацца, убачыўшы, як прыніжаюць настаўніка.

Вадзім Кнышаў выказаў падзяку **заснавальніку газеты (Міністэрству адукацыі) і асабіста міністру адукацыі Міхаілу ЖУРАЎКОВУ** за тое, што «яны накіроўваюць, але не ўмешваюцца, разумеючы, што лепш за нас гэту справу ніхто не зробіць».

На думку галоўнага рэдактара, сёння немагчыма ўявіць сабе «Настаўніцкую газету» без вернасці роднаму слову.

— Мы не палітызуем моўнае пытанне, — падкрэсліў Вадзім Кнышаў, — а проста прафесійна робім вельмі адказную, сацыяльна значную і карысную справу на нашай роднай беларускай мове.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

# Сустрэнемся ля Манюшкі

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Так, у Мінску запланавана святкаванне 125-годдзя з дня нараджэння Максіма Багдановіча, 120-годдзя з дня нараджэння Кандрата Крапівы, 95-годдзя з дзён нараджэння Івана Шамякіна і Івана Мележа, 130 гадоў з дня нараджэння Змітрака Бядулі, 140 гадоў з дня нараджэння Алаізы Пашкевіч. У студзені ўжо адбыліся мерапрыемствы з нагоды 75-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Мулявіна.

Пільную ўвагу нададуць ахове і папулярызацыі гісторыка-культурнай спадчыны беларускага народа. Дарэчы, на тэрыторыі Мінска знаходзяцца больш за 630 такіх аб'ектаў. Сёлета запланаваны шэраг семінараў па ахове гісторыка-культурнай спадчыны, адкрыццё музейных экспазіцый на базе сярэдніх і дзіцячых музычных школ, бібліятэк і музеяў горада. Між іншым, нарэшце абяцаюць завяршыць стварэнне музейнай экспазіцыі «Мінская конка» побач з гарадской ратушай.

## НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ ТРАДЫЦЫІ І ПАМЯЦЬ

План мерапрыемстваў па правядзенні Года культуры ў Мінску пройдзе пад знакам папулярызацыі беларускай мовы і выхавання патрыятызму. Напрыклад, будзе праведзены Тыдзень беларускай мовы, адбудзецца фестываль беларускай моды «Этнастыль». Мінчан чакаюць і іншыя падзеі, накіраваныя на развіццё і падтрымку нацыянальных, духоўных і культурных традыцый. Гэта ўжо любімая многімі акцыя «Ноч музеяў», рэспубліканскі конкурс бібліятэк, фестываль-кірмаш «Вясновы букет», Дзень беларускага пісьменства, гарадскі фестываль народнай творчасці «Сузор'е».

Вялікая ўвага надаецца захадам па развіцці і падтрыманні прафесійнага беларускага мастацтва. Гаворка ідзе і аб папаўненні матэрыяльна-тэхнічнай базы тэатральна-відовішчных устаноў Мінска, і аб праектах, звязаных з прафесійным мастацтвам, а таксама пра арт-праекты ў адкрытай гарадской прасторы («Мастак і горад», «Арт-астравы», «Джазавыя суботы « і інш.). Гэтыя ўжо ўпадабаныя мінчанамі і гасцямі сталіцы падзеі будуць сканцэнтраваны на тэрыторыі Верхняга горада.

Пройдзе і цыкл мерапрыемстваў, прымеркаваных да 75-годдзя пачатку Вялікай Айчыннай вайны, а таксама да 30-й гадавіны аварыі на Чарнобыльскай АЭС.

Знакавымі Сяргей Мядзведзеў назваў дзеі ў мемарыяльным комплексе «Трасцянец», што пройдуць у чэрвені. Дарэчы, на яго будаўніцтва жыхары Беларусі і іншых краін ахвяравалі звыш 1,2 млрд рублёў і 400 тысяч еўра. Комплекс узводзіцца на тэрыторыі Заводскага раёна сталіцы, дзе ў гады вайны быў лагер смерці «Трасцянец».

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.** *seradzyuk@zviazda.by*

# ЗАПЛАЦІ ДОЎГ — АДДАЙ КВАТЭРУ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Усяго ж у вобласці на 1 студзеня 2016 года налічваецца амаль 34 тысячы пратэрмінаваных асабовых рахункаў на агульную суму 7 млрд рублёў. Аднак спагнанне запазычанасці — справа не аднаго дня. Гэта цэлы комплекс мерапрыемстваў.

— Найбольш праблемны для спагнання з'яўляецца запазычанасць з перыядам утварэння ад 1 да 3 гадоў і звыш гэтага тэрміну, — адзначае Алег Спірыдонаў. — Каб неяк уздзейнічаць на сумленне даўжнікоў і скараціць пратэрмінаваную запазычанасць, нашы супрацоўнікі афармляюць выканаўчыя надпісы і падаюць іскі ў суды на спагнанне доўгу. За 2015 год было пададзена амаль 15 тысяч выканаўчых натарыяльных надпісаў на суму 10,5 млрд рублёў. Таксама за гэты перыяд пададзена 1720 іскаў у суды на спагнанне доўгу на суму больш 2,4 млрд рублёў.

Але ж меры прымусовага характару — гэта толькі ў тым крайнім выпадку, калі не дапамагаюць ніякія іншыя. У першую чаргу камунальнікі праводзяць інфармацыйна-тлумачальную работу з даўжнікамі. На стэндах у жыллёва-эксплуатацыйных службах, на ўваходах у пад'езды жылых дамоў змяшчаюць інфармацыю пра тых, хто мае запазычанасць, нагадваюць пра неабходнасць своечасовай аплаты.

Між тым існуючым заканадаўствам прадугледжана магчымасць спісання пені тым грамадзянам, якія маюць пратэрмінаваную запазычанасць па аплаце жыллёва-камунальных паслуг, — пры ўмове пагашэння імі сумы асноўнага доўгу. Гэта значыць, што калі грамадзянін ужо заплаціў суму асноўнага доўгу пры наяўнасці аб'ектыўных прычын, што паўплывалі на ўзнікненне запазычанасці, ён можа звярнуцца з заявай у жыллёва-эксплуатацыйную арганізацыю аб спісанні пені. Канчатковае рашэнне прымаюць мясцовыя выканкамы.

Крайняй мерай уздзеяння на даўжнікоў з'яўляецца высяленне. Так, у Жлобіне сям'я з дваіх чалавек (маці з сынам) завінавацілися звыш 11 млн плюс пеня ў 20 млн. І гэта дало падставы камунальнаму прадпрыемству «Жылкамсэрвісдва» ўручыць наймальніку патрабаванні аб скасаванні дагавора наймання жылога памяшкання з прапановай пагасіць за месяц запазычанасць па аплаце жыллёва-камунальных паслуг. І калі рэакцыі не дачакаліся, прыйшлося звярнуцца ў суд. У выніку грамадзяне пакінулі кватэру і перахалі ў значна горшае памяшканне.

— Паводле закона, першай умовай для высялення даўжніка з'яўляецца няплата за жыллё на працягу больш як шасці месяцаў запар. Уладальнік такой кватэры атрымлівае па пошце папярэджанне ад мясцовай адміністрацыі, — тлумачыць Алег Спірыдонаў. — На пагашэнне запазычанасці яму даюць месяц. Калі за гэты час ён не ліквідуе яе цалкам і магчымасці вяртання доўгу за кошт іншай маёмасці ўласніка няма, выканкам мае права сваёй іскавай заявай прымусіць яго да адчужэння жылля. Калі за год яно і не было прададзена, а доўг не вылучаны, жыллё па рашэнні суда падлягае прымусоваму продажу з публічных таргоў. З сумы, атрыманай пасля аўкцыёну, аплочваецца запазычанасць. Уласніку на працягу двух месяцаў вяртаюцца рэшткі сродкаў і набываецца новая жылая плошча. Яна можа быць меншай за ранейшую, саступаць ёй па спажывецкіх якасцях і нават знаходзіцца ў іншым населеным пункце.

Калі ж на наймальніка на працягу года складаюць тры і больш адміністрацыйныя пратаколы за парушэнне правіл пражывання, то разам з членамі сям'і яго могуць выселіць нават без прадастаўлення іншай жылплошчы. Размова ідзе пра псаванне маёмасці дома, стварэнне антысанітарных умоў пражывання, скандалы, хуліганскія дзеянні ў дачыненні да суседзяў і іншыя парушэнні. У любым выпадку падставы павінны быць вельмі важкімі. Летась такіх выпадкаў на Гомельшчыне не было.

Між тым колькасць іскавых заяў, якія падалі на даўжнікоў камунальнікі вобласці, павялічылася ўдвая. Калі за 2014 год іх было 22, летась — ужо 44. Як паказвае практыка, большасць з тых, на каго падаюць іск, усё ж у апошні момант (непасрэдна падчас судовага працэсу) знаходзяць грошы, каб аплаціць вялікі доўг за паслугі ЖКГ.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

■ Крымінал

# ПАПАЛІСЯ НА МАХЛЯРСТВЕ

**Сужэнцам пагражае да 10 гадоў пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці**

**Дорага можа абысціся двум магілёўскім прапрымальнікам спроба выдаць сябе за маладазабяспечаных. Следствам устаноўлена, што абвінавачаныя наўмысна знізілі свой сукупны даход і прадставілі ў адпаведныя арганізацыі недакладныя звесткі.**

— На падставе гэтых ілжывых дакументаў іх сям'я з 5 чалавек была зацверджана ў спісах грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў і могуць разлічваць на льготны крэдыт, — паведаміў падрабязнасці справы **намеснік начальніка ўпраўлення Дэпартамента фінансавых расследаванняў КДК па Магілёўскай вобласці Аляксандр ШАРОЙКІН**. — На імя жанчыны была адкрыта крэдытная лінія.

Дарэчы, сужэнцы не ўпершыню трапілі ў поле зроку праваахоўнікаў. Падман раскрыўся падчас праверкі ўпраўленнем па барацьбе з эканамічнай злачыннасцю УУС аблвыканкама яшчэ аднаго факта махлярства з іх боку. Зараз муж з жонкай затрыманы, на іх маёмасць коштам 10 мільярдаў рублёў накладзены арышт. У адносінах да іх распачата крымінальная справа па артыкуле 209 (часткі 2 і 4). Зараз яна разглядаецца ўпраўленнем Следчага камітэта па Магілёўскай вобласці.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

Сямейная газета
Выпуск № 2 (45)



## ДОБРАЯ ЖОНКА = МУДРАЯ ЖОНКА

Незадоўга да вяселля мы з будучым мужам склалі спісы сваіх чаканняў адно ад аднаго. ...Мой галоўны страх быў звязаны з побытам. І не дзіўна: колькі сябе памятаю, чула, што добрая жонка ПАВІННА гатаваць штодзень: першае, другое і кампот. Прыклад быў навідавоку: наглядзелася на замужніх сябровак, якія стаяць каля пліты як мінімум зранку і ўвечары. Ды і бабуля Вовы некалькі разоў намякала, што ўнук вельмі любіць піражкі з капустай, а супу можна наварыць адразу столькі, каб на два дні хапіла.

Вова ж папрасіў не абмяжоўваць свабоду яго захапленням: не забараняць іграць на гітары, хадзіць на рэпетыцыі, глядзець футбол, сустракацца з сябрамі... Кажуць, што калі мужчына жэніцца, ён развітваецца са сваёй свабодай. Жарт жартам, але ў многіх сем'ях так і ёсць. Вось, напрыклад, Віталька... Раней часта хадзіў з сябрамі ў паходы, быў душой кампаніі. Цяпер жа бачым яго гады ў рады. На кожную прапанову сустрэцца знаходзіцца адгаворка: дзеці, праца, жонка... Яна, дамаседка па натуры, ледзь што — кідаецца словамі «выбірай: альбо я, альбо яны». Не разумее, што свядома абмяжоўваючы свабоду сваёй палавінкі, робіць горш у тым ліку і сабе. Бо незадаволенасць мае ўласцівасць нарастаць як снежны камяк. Калі ж муж будзе адчуваць, што яго свабоду цэняць, ён, ведаю не па чутках, абавязкова аддзячыць.

Праз чатыры месяцы будзе год, як мы ажаніліся. Але Вова выконвае сваё абяцанне. Калі ў мяне няма настрою стаяць пры пліце — слова не скажа, не папракне. А пойдзе і здзівіць чарговым кулінарным эксперыментам. Ведае, што вярнуся дадому стомленая — зварыць кашу ці патушыць гародніну. Больш за тое, нават калі я збіраюся прыгатаваць клёцкі з грыбамі або пірагі са шпінатам, што адымае нямала часу, ён кажа: «Навошта? Пасмаж лепш яйкі. А ў сэканомлены час зрабі што-небудзь для душы, пачытай, напрыклад, ці на джамбэі паіграй...» І, ведаеце, паводзіны мужа робяць цуд. Я пачала атрымліваць задавальненне ад прыгатавання ежы, бо адчуваю, што раблю гэта не таму, што ПАВІННА. А таму, што хачу паклапаціцца пра блізкага чалавека.

Я ж, на жаль, час ад часу забываюся на сваё абяцанне. Не так даўно Вова прапанаваў разам схадзіць на каток. Я спачатку згадзілася. Але, вярнуўшыся з працы, адчула такую стому, што жаданне кудысьці ісці знікла. Не б — проста адмовіцца і прапанаваць яму схадзіць без мяне, дык я чамусьці пачала абвінавачваць мужа ў тым, што ён мінулы раз на катку гуляў з хлопцамі ў хакей — замест таго, каб ездзіць са мной за ручку. У выніку, як вы здагадаліся, вечар быў крыху сапсаваны. Хоць на каток мы ўсё ж такі пайшлі.

Мудрасць (гэта факт!) прыходзіць не за дзень і нават не за восем месяцаў. Таму я працягваю выпрацоўваць ВАЖНУЮ звычку — часцей ставіць сябе на месца блізкага чалавека. Паважаць яго жаданні, а не навязваць свае. І праграворваць кожную канфліктную сітуацыю. Каб праз 30 гадоў не атрымалася, як у прытчы пра булку...

У дзень 30-годдзя сумеснага жыцця жонка, як звычайна, спякла булачку (яна пякла яе штораніцы, гэта было традыцыяй). За сняданкам разрэзала яе папярок, намазала маслам абедзве часткі, і, як звычайна, працягвае мужу верхнюю. Але на паўшляху яе рука спынілася. Жанчына падумала: «У дзень нашага жамчужнага вяселля я хачу з'есці гэтую румяную частку булачкі сама, я пра яе марыла 30 гадоў. У рэшце рэшт, я была ўзорнай жонкай, нарадзіла і выхавала цудоўных сыноў, вяла гаспадарку...» І вось яна падае ніжнюю частку булачкі мужу, а ў самой рука дрыжыць — як-ніяк, парушэнне 30-гадовай традыцыі. Мужчына нават праслязіўся ад шчасця: «Які неацэнны падарунак ты зрабіла мне, дарагая! 30 гадоў я не еў сваю любімую, ніжнюю частку булачкі, бо лічыў, што яна па праве належыць табе...»

**Надзея ДРЫЛА.**

■ Сустрэча БЕЗ АБЗАЦАЎ

Ілона ГЕРАШЧАНКА:

# «ДЗЕЦІ НАРАДЖАЮЦЦА НЕ ДЛЯ БАЦЬКОЎ»

**Так склалася, што наша сустрэча з заснавальніцай і дырэктарам Міжнароднага адукацыйнага клуба Global Child Ілонай ГЕРАШЧАНКАЙ адбылася ў вельмі няпросты перыяд яе жыцця. Былы муж вось ужо больш за год не дазваляе ёй бачыцца з дачкой Міланай. Відэа, якое не так даўно з'явілася ў інтэрнэце, дзе 8-гадовая дзяўчынка просіць тату дазволіць ёй абняць маму, думаю, нікога не пакінула абыякавым. Ілона сабрала амаль 10 тысяч подпісаў пад петыцыяй за вяртанне дачкі, а таксама звярнулася з адкрытым лістом у Адміністрацыю Прэзідэнта. І марыць толькі пра адно: каб «дай Бог, гэты жах хутчэй скончыўся».**



Фота Надзеі БУЖАН.

## Пра дно, 15 хвілін і амбіцыі

**Самае страшнае для кожнай маці** — працяглая расстанне са сваім дзіцем. Сёння я ўпэўнена магу сцвярджаць, што ва ўзросце да 8 гадзікаў у дачкі з маці ёсць фізічная сувязь, гэта закладзена прыродай. Я вельмі глыбока перажываю разрыў. Адчуваю яго кожнай клетачкай... Для мяне Мілана — гэта ўсё: сэнс, жыццё. Тое, дзеля чаго варта прачынацца раніцай, штосьці рабіць. І дзіцячы клуб свой я стварала дзеля яе. Ведаю, што мяне вельмі добра разумеюць людзі, якія самі нешта страчвалі.

**Вельмі важна** з кожнай трагедыі, жыццёвага ўрока рабіць высновы. Задаваць сабе пытанні: «Чаму гэта адбываецца са мной? Што я раблю не так?» І чэсна адказваць на іх. Калі высновы не зроблены, урок, лічы, прайшоў дарэмна, і ты застаешся на тым жа ўзроўні. Мне вельмі падабаецца фраза: «Каб пачаць рухацца ў іншым кірунку, чалавеку трэба спачатку дайсці да дна». Я ўжо дастала да самага дна, адштурхнулася і зрабіла свае высновы. І менавіта гэта дае мне сілы рухацца далей.

**Я выходзіла замуж па каханні.** Мілана — доўгачаканае і бясконца любімае намі дзіця. Мне шчыра шкада, што праз нейкі час у нашай сям'і з'явілася месца скандалам, у тым ліку і пры дачцэ. Я зразумела, што ўсё, стоп. Гэта ўжо не толькі мая гісторыя. Гэта гісторыя маёй дачкі ў тым ліку. Лічу, што дзецям не трэба бачыць нешчаслівых бацькоў, сваркі, непаразуменне. Інакш яны гэта далей у свае сем'і панясуць. Я пераканана, што шчаслівыя дарослыя вырастаюць са шчаслівых дзяцей. Калі вы не можаце паказаць малечы прыклад таго, як будаваць добрыя адносіны, як паважаць адно аднаго, падтрымліваць, то лепш разысціся.

**Ніколі не забараняла** былому мужу бачыцца з Мілашай. Пакуль дачка жыла са мной, тата праводзіў з ёй амаль палову часу. Пасля таго, як ён вырашыў забраць Мілану, я не магу пабыць з ёй больш за 15 хвілін — столькі бачу дачку на перапынках у школе.

**Вельмі хачу**, каб мая дачка адчувала сябе шчаслівай. Таму заўсёды імкнулася дамовіцца з былым мужам. Падчас адной з апошніх размоў сказала яму: «Я разумею, што ў жыцці Міланы будуць такія непаўторныя падзеі, як выпускны, вяселле, на якіх мы будзем з табой разам прысутнічаць. Давай навучымся нармальна мець зносіны дзеля нашай дачкі, думаць у першую чаргу пра дзіця, а не карміць свае амбіцыі, даказваць камусьці штосьці». На гэта ён у жорсткай форме адказаў мне: «Не, так не будзе!» Я не ведаю, чым кіруецца былы муж (гэта яго жыццё, яго выбар), але калі ён не дазваляе праводзіць час з Мілашай, мне нічога не застаецца, як звяртацца ў суд.

*(Заканчэнне на 4 стар. «СГ».)*

■ У вас будзе дзіця

# Маленькі чамучка

**Вось ужо чатыры гады на тэлеканале АНТ у рамках праграмы «Пакуль усе дома» выходзіць беларуска-расійская рубрыка «У вас будзе дзіця». За гэты час 65 малых знайшлі клапатлівых бацькоў. Спадзяёмся, што з нашай дапамогай гэтая лічба яшчэ павялічыцца. Таму працягваем знаёміць патэнцыйных усынавіцеляў і апекуноў з дзеткамі, якія больш за ўсё на свеце мараць пра сям'ю і ўтульны дом...**



Пакуль што 6-гадовы Мікіта жыве ў Андрэеўскім дзіцячым доме, што ў Віцебскай вобласці. «Ласкава мы называем яго Мікітачка, — распавядае выхавацель **Аксана ПУРАНКОВА**. — Гэта вельмі актыўны, эмацыйны, добразычлівы і надзвычай цікаўны хлопчык. Сапраўдны маленькі чамучка *(усміхаецца)*. Ён задае вельмі шмат «чаму?» і шукае на іх адказы. Прычым на тысячу адказаў у яго зноў знаходзіцца тысяча новых пытанняў».

Развагі самога Мікіты прыемна здзіўляюць: «Я люблю гуляць з дзеткамі. Прасіць: дай мне, калі ласка, цацку. Дзяліцца трэба. Не біцца. Па чарзе трэба гуляць, не забіраць, не ламаць...».

У наступным годзе Мікіта ідзе ў школу. Хлопчык вельмі чакае той дзень, калі ён апране школьную форму, ранец. «Мікітачка прыйшоў да нас зусім маленькі, першым яго словам было «кніга», — узгадвае выхавацелька. — З таго часу ён з кнігай не расстаецца. Самае галоўнае яго захапленне на дадзены момант — транспарт. Тэхнікам, напэўна, будзе ў будучым. Ён ужо канструюе машыны новага пакалення, гэтым дзеліцца з намі. Гэта так цікава, што іншым разам дзівімся: адкуль у такога маленькага чалавечка з'яўляецца столькі неверагодных ідэй, думак? Хачу пажадаць Мікітачку, каб у яго ў новым годзе з'явіліся клапатлівыя бацькі, якія б яго палюбілі і падзялялі яго інтарэсы».

***Калі вы хочаце даведацца пра Мікіту больш, патэлефануйце па нумары (017) 284-71-51 спецыялістам Нацыянальнага цэнтра ўсынаўлення Міністэрства адукацыі. Таксама для тых, хто хоча ўсынавіць дзіця, на сайце videopassport.ru змешчаны відэакурсы, падрыхтаваныя сумесна НЦУ і творчай групай праекта***

■ Нататкі таткі



# ЦЁПЛЫЯ ТРАДЫЦЫІ

**Летась у падарунак бабулям і дзядулям мы зрабілі каляндар з фотаздымкамі Васілісы. Усе 12 месяцаў ён радаваў родных. Калі ж прыйшоў 2016 год, ніхто не паспяшаўся зняць яго са сцяны. Проста пачалі адлік старонак па другім крузе. Убачыўшы такое, мы вырашылі хуценька мабілізавацца і падрыхтаваць новы каляндар. «Напэўна, гэта будзе ўжо нашай традыцыяй», — сказала жонка, калі праца была завершана. Традыцыя... Сэнсу гэтага слова пасля нараджэння дачкі я стаў надаваць куды большае значэнне. Бо хочацца, каб малая вырасла ў сям'і, дзе ёсць не толькі каханне і ўзаемапавага, але і традыцыі.**

У нашай сям'і ахоўнікам і праваднікам традыцый заўсёды была маці. Па вялікім рахунку ўсе яны датычыліся рэлігійных свят. Бацька да гэтага ставіўся вельмі скептычна. Часта нават байкатаваў тыя ці іншыя абрады, але маці ніколі не паддавалася на «правакацыі». Таму ў Вербную нядзелю мы з радасцю падстаўлялі свае бакі пад «удары» прынесеных з царквы галінак. Усе тры дні Вялікадня на снядана у першую чаргу частаваліся свянцонымі яйкамі і булкай. На Тройцу падлога ў хаце высцілалася духмяным аерам, а абразы аздабляліся кляновым лісцем. З кожным святам быў звязаны свой адмысловы рытуал, які мы заўсёды выконвалі з нейкай унутранай узнёсласцю. Пачыналася ўсё з Новага года. У адрозненне ад большасці сем'яў, ёлку мы ўпрыгожвалі менавіта 31 снежня, за некалькі гадзін да бою курантаў, калі ўжо быў накрыты стол. Так, у адно імгненне стваралася непаўторная святочная атмасфера. Далей на чарзе былі Каляды. Усе з нецярпеннем чакалі вечара напярэдадні Раства. Калі на небе з'яўлялася першая зорка, маці ішла ў хлеў па сена. Прыходзіла з ім у дом і віншавала ўсіх са святам. Сена раскладвалася пад абрус, і на стол падавалася 12 посных страў. Падчас вячэры мы абавязкова тройчы падымаліся, заплюшчвалі вочы і клікалі Мароза есці куццю.

У дзяцінстве ўсе пералічаныя абрады падаваліся цікавымі, у падлеткавым узросце — дзіўнымі і несучаснымі, у студэнцкія гады было не да іх, а калі стварылі ўласныя сем'і, то большасці традыцый месца ў іх чамусьці не знайшлося. Толькі цяпер, калі сам стаў татам, я зразумеў, якой цеплыні яны напаўнялі наша жыццё. Большасць самых яскравых дзіцячых успамінаў звязана менавіта з імі. Дзякуючы гэтым абрадам, сёння я адчуваю сябе не дробнай кропляй у моры гісторыі, а часткай роду, у якім ёсць сувязь паміж пакаленнямі.

Сёлета мы ўпершыню сустракалі Каляды ва ўласным доме. З улікам асаблівасцяў гарадскога жыцця не ўсе патрабаванні атрымалася выканаць, але асноўная ідэя была захавана. Васіліса з цікавасцю спрабавала Марозаву кашу, падазрона глядзела, як тата і мама клічуць яго на куццю, і не магла зразумець, чаму той не ідзе. Раніцай жа, як толькі селі снедаць, яна найперш на поўным сур'ёзе пачала клікаць «Маёза». Стрымліваючы ўсмешкі, патлумачылі, што той ужо прыходзіў ноччу. Гледзячы на засяроджанасць малой, стала зразумела: Каляды ў сям'і прыжывуцца.

Прыжывуцца і звычаі, якія перайшлі да нас ад родных па лініі жонкі. Тут таксама ёсць шмат чаго цікавага і вельмі сакральнага, напрыклад, умыванне велікодным яйкам. З гэтым абрадам у нас звязана адна цікавая гісторыя. На першы Васілісін Вялікдзень Віка пайшла ў царкву асвяціць прысмакі, а я застаўся за нянькү. Дык вось пад раніцу прачнуўся ад плачу, але не малой, а жонкі. Высветлілася, што тая, вяртаючыся з царквы, разбіла «фарбаванкі». «Што я за маці такая, як цяпер бітым яйкам умываць дачку», — дакарала сябе жонка...

Працягваць традыцыі, якія засталіся нам ад продкаў, надзвычай важна, але пры гэтым не менш важным з'яўляецца і фарміраванне ўласных. Зразумела, што яны не могуць прэтэндаваць на такую глыбіню, але адназначна стануць адметнасцю менавіта вашай сям'і. У нас з тых, што непасрэдна звязаны з Васілісай, пакуль ёсць толькі адна: штогод на Купалле фатаграфуем дачку з валошкавым вянком. Такіх здымкаў у архіве пакуль толькі два, але ён абавязкова будзе папаўняцца, як і спіс нашых традыцый у будучым.

**Аляксандр АЛЕСІК** ■

■ Бацькавы сакрэты

# ШЧЫРАСЦЬ РАТУЕ СЯМ'Ю



Фота з сайта pravmir.ru.

**Яшчэ гадоў дзесяць таму мы калектыўна захапляліся не заморскім «Гары Потарам», а прыгодамі нашай дзяўчынкі «Тані Гротэр», а некаторыя з маіх сяброўак — і «Мяфодзіем Буслаевым». Праз нерэальныя, фантастычныя падзеі гэтых кніжак часам праступалі вельмі шчодрыя на жыццёвую мудрасць думкі. Іх аўтар — Дзмітрый Емец — тата сямі дзяцей, добры муж, не заўсёды меў такі «скарб»... Затое цяпер ён шчыра дзеліцца законамі сямейнага шчасця і ўменнем мірна ўжывацца ўдзевяцярых. Па-хрысціянску.**

## ПАБАЧЫЎ І ЗРАЗУМЕЎ: НА ЎСЁ ЖЫЦЦЁ

— Я вучыўся ў аспірантуры філфака МДУ, а Маша, мая жонка, — на трэцім курсе таго ж факультэта. Яна працавала лабарантам на вячэрнім аддзяленні і вельмі мне спадабалася. Такая імклівая была, дынамічная і валасы ў яе вельмі вілістыя.

Усё атрымалася вельмі плаўна, без фіксаванай даты. Мы пажаніліся пасля таго, як у нас з'явілася другое дзіця: тады яшчэ не былі ўвацаркаўлёныя (у Царкву прыйшлі, ужо з'яўляючыся бацькамі чацвярых дзяцей). Але мне з самага пачатку было зразумела, што гэтыя адносіны на ўсё жыццё.

Раней я не ўяўляў сябе шматдзетным, але калі нарадзіліся двое малых, мне гэта спадабалася і захацелася, каб іх стала больш. Першы час быў няпросты. Не хапала грошай. Не складваліся адносіны ў Машы з маімі бацькамі... І ўсё гэта на фоне першай цяжарнасці жонкі. Першыя два гады сумеснага жыцця наогул няпростыя. Людзі прывыкаюць адзін да аднаго, вылазяць усялякія дробныя звычкі, якія іншаму могуць падацца невыноснымі.

Чарговы напружаны момант паўстаў, калі мы чакалі трэцяе дзіця. Грошы ў сям'і зусім зніклі. Я думаў: «Грошай няма ў нас, затое дзіця будзе. Нічога! Што-небудзь прыдумаем!». На трэцяе дзіця Бог заўсёды нейкія падарункі дае людзям. У кагосьці праца добрая з'яўляецца, у кагосьці нешта яшчэ. У мяне ж нарадзілася «Таня Гротэр», якая нас выратавала. Потым як падарунак на чацвёртае дзіця прыйшла ідэя «Мяфодзія Буслаева». Ён стаў галоўным нашым карміцелем.

## ТЭОРЫЯ ШМАТДЗЕТНАСЦІ

Памятаю, педагог па стараслову ва ўніверсітэце сказаў, што псіхалагічна чалавек адрознівае толькі тры лікі — адзін, два і шмат. Гэта значыць тры, чатыры, дзесяць і сто — гэта ўсё ў роўнай ступені шмат. Адзін кластар памяці за гэта адказвае. Дык вось і атрымліваецца «аднадзетнасць», «двухдзетнасць» і «шматдзетнасць». Найскладаней пераступіць бар'ер паміж другім і трэцім дзіцем. Пасля трох ужо звычайна не лічаць, і гэта добра.

Ты проста пачынаеш адчуваць, што дзеці з табой заўсёды. Едзеш, дапусцім, на веласіпедзе катацца — яны ў адмысловым заплечніку, на дзіцячым сядзенні. Ты ўвесь час праводзіш з дзецьмі, як мама-кенгуру. І гэта выдатна.

Міша ў нас нарадзіўся з вагой 1 кілаграм 470 грамаў. Ён у мяне ўвесь змяшчаўся на далоні. У выніку некаторых складанасцяў атрымаў ДЦП. Левыя рука і нага ў яго дрэнна працавалі. Нага яшчэ нічога — ён нават бегае вельмі хутка. І плавае нядрэнна. А левая рука працуе, мякка скажам, дрэнна. Калі трэба ў садку нешта абараняцца, ён ілбом навучыўся бадацца.

Сын пакуль не адчувае нязручнасцяў. Не параўноўвае сябе з іншымі. Толькі часам пытаецца: «Чаму Бог зрабіў такое з маёй рукой?» Ну, мы адказваем нешта такое правільнае, але на самай справе адказу пакуль не ведаем. Некаторыя сем'і замыкаюцца, а некаторыя нараджаюць яшчэ некалькіх дзяцей, і ў іх адаптацыя значна лепш праходзіць, і жывуць яны весялей.

Увогуле галоўная задача ў выхаванні — вылучэнне прыярытэтаў. Ёсць рэчы, якія павінны быць зроблены абавязкова, а ёсць другарадныя. Дапусцім, мая галоўная справа — усіх дзяцей развесці па занятках і своечасова здаць свае рукапісы. Пакуль гэтыя справы не зроблены, я не буду нішто іншае браць пад увагу.

**Найскладаней пераступіць бар'ер паміж другім і трэцім дзіцем. Пасля трох ужо звычайна не лічаць, і гэта добра.**

Раней нам здавалася, што нашы дзеці злыя, неакуратныя, не прагнуць вучыцца, не з тымі сябруюць, з прафесіяй не вызначыліся. Кожны раз была жудасная трагедыя. Потым мы зразумелі, што гэта нармальна. Калі дзяцей некалькі, ты ўжо абвыкаеш, што чалавек па меры набыцця розуму пераживае нейкія стадыі, не заўсёды прыемныя бацькам. Напрыклад, Воля была неахайнай да дзесяці гадоў, потым раптам аўтаматычна ў ёй нейкі нябачны тумблер пераключыўся, яна ўвесь час свой пакой мые, прыбірае, пыласосіць. Або дзіця не хоча чытаць кнігу, хавае пад канапу, а праз паўгода глядзіш: ад кніжкі не адарваць. Гэта значыць трэба проста не баяцца, разумець, што ўсё прыйдзе ў свой час, і радавацца таму, што ёсць сёння.

## ДАРОГА Ў ХРАМ

Мы раней прыходзілі ў храм пару разоў у год — асвячалі кулічы на Вялікдзень і ставіліся да гэтага як да традыцыі, не болей. І вось у 2007 годзе пасябравалі з айцом Барысам з маскоўскага храма Сафіі, Прамудрасці Божай — у яго чацвёра дзяцей у той час было, у нас таксама чацвёра, шмат аказалася агульнага, і нейк пад яго ўплывам паступова прыйшлі да веры. Цяпер і ў бацюшкі сямёра дзяцей, і ў нас сямёра.

Спрабуем прывесці да веры і дзяцей, але пакуль яшчэ незразумела, наколькі трывала ў іх усё складзецца. Шмат спакусаў, хістанняў. Я зразумеў, што нельга дзецям хлусіць у нейкіх важных рэчах. Яны ўвесь час спрабуюць злавіць бацькоў на неадпаведнасці іх спраў і слоў. Янку, напрыклад, вострa хвалюе пытанне: «Вось вы амаль дзесяць гадоў ходзіце ў храм. Ніводнай нядзелі не прапусцілі. Ці сталі вы лепшымі? Што ў вас змянілася?»

У любым чалавеку існуе фільтр праўды. Я яго адчуваю, калі кнігі пішу, і ведаю, што чытач убачыць, калі ты вырашыш падмануць нават на працягу адной старонкі, ён адчуе фальш. У сям'і гэтая няпраўда застанецца, потым яна недзе ўсплыве і парушыць адносіны. Таму ні ў кнігах, ні ў адносінах з дзецьмі хлусні не дапускаю. І мне здаецца, гэта і ратуе сям'ю.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**
*pustavit@zviazda.by* ■

■ Парады псіхолага

# ШТО ПАЧЫТАЦЬ ЦЯЖАРНАЙ?

**На пытанні чытачоў адказвае Кацярына ШАВЯЛЁВА, практыкуючы перынатальны псіхолаг, кансультант па родах, магістр сацыяльных навук, аўтар шматлікіх артыкулаў па псіхалогіі і маці траіх дзяцей.**



***«Добры дзень! Я чакаю дзіця. У мяне яшчэ зусім невялікі тэрмін — 15 тыдняў, але задумваюся, як буду яго выхоўваць, чытаю розныя кнігі. Можа, падкажаце, да якой літаратуры лепш звярнуцца? Я праваслаўная, таму хацелася б атрымаць у адказ штосьці ў традыцыйным рэчышчы».***

**Кацярына, 23 гады, Жлобін.**

Пастараюся параіць папулярную літаратуру па псіхалогіі, даступную кожнай жанчыне. Пачнём з кніг «**Беременность. Роды. Материнство**» **Кацярыны Бурмістравай**. Яна псіхолаг-кансультант, праваслаўны чалавек. У яе 10 дзяцей, таму ўвесь яе досвед увасабляецца ў кнігах. У Кацярыны ёсць і добры сайт www.semya-rastet.ru, на якім шмат артыкулаў, аўдыяматэрыялаў. На ім і ў кнігах усё напісана настолькі даступна, што зразумець можа нават чалавек без псіхалагічнай адукацыі.

Таксама існуе праваслаўны аўтар, акушэр-гінеколаг **Людміла Баракава** і кніга «**Брак и дети сегодня**». У яе вельмі ашчадны падыход да цяжарнасці з медыцынскага пункту гледжання. Яшчэ адна цудоўная кніга — «**Тайная опора. Привязанность в жизни ребенка» Людмілы Петраноўскай.** Цяжарным, якія прыходзяць да мяне на прыём, я найстойліва раю яе прачытаць. У кнізе псіхолаг вельмі кранальна апісвае, якім бачыць свет немаўляці.

Што тычыцца сусветна вядомых твораў, то тут можна назваць «**В ожидании ребенка» Марты і Уільяма Сірс**. Гэтая серыя кніг лічыцца класікай, самым папулярным выданнем аб развіцці цяжарнасці, дзе яна разглядаецца тыдзень за тыднем.

***Калі ў вашай сям'і ўзнікла складаная сітуацыя і вы не можаце разабрацца самастойна — спытайце парады ў спецыяліста. Пытанні дасылайце на электронную пошту pustavit@zviazda.by ці на адрас: «Звязда», вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск.***

■ Людзі і лёсы

# КОЛЬКІ КАШТУЕ «ПАСПЫТАЦЬ»,

## або Што страчваеш і што набываеш, трапіўшы за краты?

**У Яўгеніі — бяда. Яе сына пасадзілі ў турму. За ўжыванне курыльнай сумесі.**
**Гэты ціхі, трохі замкнуты, у жыцці беспраблемны хлопец, здаецца, толькі пачаў жыць: пасля школы скончыў тэхнікум, уладкаваўся на працу, марыў грошай на машыну назбіраць.**



ПЕРШЫ раз Віця паспытаў выпадкова, нехта прапанаваў. Неўзабаве пачаліся сваркі з каханай, даведаўся пра яе нявернасць. Здраду дараваць не мог, і адпусціць не атрымлівалася. Раптам успомніў пра «панацэю». І расслабіцца можна, і праблемы забудуцца. Вось табе і забыліся. 2 гады за кратамі. І гэта яшчэ па мінімуме. Адвакат, якая вяла справу, сказала, што за такія парушэнні вельмі сур'ёзна ўзяліся, не цырымоняцца. Падобныя пасяджэнні амаль кожны дзень ідуць. Але сапраўдных наркаманаў сярод абвінавачаных няшмат. У асноўным выпадковыя ахвотнікі пакаштаваць дорага расплачваюцца за сваю цікаўнасць. Пакурыў сам — атрымаеш ад 2 да 5 гадоў зняволення, дасі пакурыць таварышу — «заляціш» на 8 (і больш) гадоў, бо гэта ўжо распаўсюджванне.

**Калі заўважыла, што сын нейкі «не такі», спужалася, пачала крычаць, злавацца, потым прасіла, размаўляла — ніякага сэнсу. Абяцае: «больш не буду», а праз гадзіну «вочы дурныя».**

Тры месяцы хлопец чакаў суда ў СІЗО. Пісаў лісты і ў кожным спадзяваўся, што неяк абыдзецца, «пранясе». Маўляў, «я нікому нічога дрэннага не зрабіў, толькі сваё здароўе псаваў». Здаецца, так лічаць многія спажыўцы забароненых рэчываў. Але чалавек у наркатычным стане — небяспека і для грамадства. «Пад кайфам» выколваюць вочы, скідваюцца з балконаў, пераразаюць вены — гэтымі жудасныміролікамі поўніцца youtube. Але ж нават такія відэа нікога не спыняюць. Праблема настолькі абвастрылася, што нагадвае эпідэмію. Нават сярод знаёмых мне людзей такія гісторыі не рэдкасць. Абкураны сын пабіў машыны суседзяў, і маці была вымушана выплаціць вялікую суму грошай. Іншы хлопец пачаў красці з дому рэчы і прадаваць, каб зарабіць на дозу.

Калі суд вынес прыгавор, Віця злаваўся, бо адвакат, як яму падалося, нічым не дапамагла.

СЁННЯ маці атрымлівае ад сына зусім іншыя лісты. У кожным з іх ён просіць прабачэння, і ў яе, і ва ўсіх родных, не толькі за тое, што зрабіў, падвёў і зганьбіў сям'ю, а нават за тое, што не можа быць побач з хворай маці. На свой лёс не жаліцца. Так, між іншым, згадвае, што «часта хочацца салодкага, што ўсе дні, як адзін, аднолькавыя, што правілы жорсткія, напрыклад, удзень на ложак нельга прылегчы, а за любое парушэнне чакае суровае пакаранне». Адвакат адзначыла цікавую рэч: у турме пакутуюць не толькі ад цяжкіх умоў жыцця, а нават ад недахопу свежага паветра і святла.

Віця вельмі сумуе па бацьках, родных, па любімым папугаі і па гітары, якую на свабодзе не выпускаў з рук. Сумуе па стрыечных пляменніках, перажывае, што тыя могуць забыцца пра яго. І прысвячае ім вершы. Раней нават не спрабаваў рыфмаваць, а цяпер радкі самі складаюцца. Пра тое, з-за чаго трапіў за калючы дрот — ніводнага слова, нібы жадае сцерці гэты ўчынак з памяці. Але часта паўтарае, што «ўсё ўзважыў, зразумеў, заслужыў пакаранне і павінен несці адказнасць», нават падкрэслівае, што не варты тых пасылак, якія маці яму дасылае.

ШТО да маці, то яна штодзень дакарае сябе: «Не засцерагла, не дагледзела, недзе дала слабіну». І бясконца шукае адказ на адно пытанне: чаму так здарылася?

«Віця рос звычайным хлопчыкам: вясёлы, добры па натуры, шпаркі. Займаўся спортам, цікавіўся матацыкламі, сам на гітары навучыўся іграць. Адзінае дзіця ў сям'і, ён амаль ні ў чым не меў патрэбы. І адкуль «атрута» ўзялася? У яго нават кампаніі ніякай не было, увечары дома за камп'ютарам, песні новыя развучваў.

Калі заўважыла, што сын нейкі «не такі», спужалася, пачала крычаць, злавацца, потым прасіла, размаўляла — ніякага сэнсу. Абяцае: «больш не буду», а праз гадзіну «вочы дурныя». Чаму ён гэта робіць, ні слова не дабілася. Адвезла ў вёску, забрала ўсе тэлефоны. Праз два тыдні прыехаў, упаў на калені: «Мамачка, я ўсё зразумеў!» Ізноў паверыла. Здаецца, як можна не паверыць свайму дзіцяці? Дарэмна. Як толькі выйшаў з дому, адключыў тэлефон, а вярнуўся хісткай паходкай. Бацька прымяніў сілу: можа, праз боль дойдзе. Не, збег з дому. Тры дні пакутлівай цішыні, ніякіх звестак, уласныя пошукі таксама не дапамаглі. Больш не магла чакаць, звярнулася ў міліцыю. Наступны раз убачыла сына толькі на судзе».

Зараз жанчыне давядзецца навучыцца жыць з думкай, што сын у турме. З сорамам перад суседзямі, калегамі па рабоце. Асуджэння не пазбегнуць, бо кожны ж думае, што яго такая бяда не закране.

Маці жыве ў чаканні лістоў ад сына, у малітве за яго, надзеяй на амністыю. «Горш як сёння ўжо быць не можа, — лічыць яна, але ў галаве надакучліва круціцца трывожныя думкі: «Што будзе, калі сын вернецца?» І ахоплівае жах, калі думае, што ўсё можа пачацца наноў».

**Яна ЛЫЧКОЎСКАЯ.**

■

### «ХВАРОБУ КАНТРАЛЯВАЦЬ НЕМАГЧЫМА»

Так лічыць **Аляксей АЛЯКСАНДРАЎ, намеснік галоўнага ўрача Мінскага абласнога клінічнага цэнтра «Псіхіятрыя — наркалогія».**

***— Як часта да вас прыходзяць людзі з наркатычнай залежнасцю?***

— Кожны дзень звяртаецца ад 10 да 30 чалавек. Звычайна гэта мужчыны (75%) ад 25 да 40 гадоў. Большасць з іх прыходзіць самастойна. Тых, каму ледзь за 18 гадоў, звычайна прыводзяць родныя.

***— Чаму, на ваш погляд, праблема сёння так абвастрылася?***

— Па-першае, ёсць прапанова. Наркотыкі прадаюцца, нягледзячы на жорсткія забароны і меры бяспекі. Пастаянна вынаходзяцца новыя формулы наркатычных рэчываў і новыя шляхі іх распаўсюджвання. У новых наркотыкаў невядомыя ўласцівасці, могуць назірацца непрадказальныя рэакцыі арганізма, што павышае рызыкі для жыцця.

Па-другое, узрос попыт. Рэгулярнае анкетаванне паказвае: заўсёды існуюць людзі, якія цікавяцца забароненымі рэчывамі. Такая цікавасць лічыцца ненармальнай.

***— Што першым чынам павінны зрабіць бацькі, калі заўважылі, што дзіця паводзіць сябе неадэкватна?***

— Раней стараліся «трымаць» праблему ў сям'і. Апошнім часам узрасла колькасць смяротных зыходаў, многія з якіх можна было прадухіліць. Таму сёння бацькі адразу б'юць трывогу. Першым чынам трэба выклікаць хуткую дапамогу ці звярнуцца ў спецыялізаваную ўстанову, дзе існуе аддзяленне таксікалогіі. Акрамя таго існуе кругласутачны ананімны тэлефон, дзе можна атрымаць адказ на любое пытанне па пэўнай праблеме. У нашым цэнтры — 202-04-01.

Часта людзі не звяртаюцца па дапамогу адразу, бо лічаць што справяцца самастойна. Але на практыцы такіх выпадкаў адзін на тысячу. Як правіла, потым прыходзяць, калі ўжо позна, бо пачаліся незваротныя працэсы ў арганізме.

Бацькі, зразумела, вераць дзецям, калі тыя бажацца, што «больш ні разу». Але звычайна гэта пустыя абяцанні, бо наркотыкі — гэта хвароба, а чалавек не можа кантраляваць хваробу. Тады бацькі пачынаюць кантраляваць сітуацыю. Яны адвозяць дзяцей за мяжу, у вёску, нават адпраўляюць у армію, адгароджваюць ад дрэннай кампаніі. Тыя, хто зусім у роспачы, ідуць на жорсткія меры, звяртаюцца ў міліцыю. Але ўсё гэта толькі на пэўны час адцягвае праблему. Нават пасля турэмнага зняволення 70—80% спажыўцоў наркотыкаў «зрываюцца» ў першы месяц, з іх 60%, што сядзелі за кратамі ўжо больш за адзін раз. Гэта сведчыць пра тое, што хвароба нікуды не дзенецца, таму абавязкова трэба звяртацца па дапамогу ў рэабілітацыйны цэнтр.

***— Колькі доўжыцца лячэнне і ў чым яно заключаецца?***

— Ведаеце, таблеткі, якая ў адзін момант пазбавіць ад залежнасці, не існуе. Патрэбны доўгі час для выздараўлення. З 2011 года ў нашым цэнтры распрацавана спецыяльная праграма рэабілітацыі. За гэты час яе прайшлі 2500 чалавек. Кожны дзень з імі працуюць псіхолагі, псіхатэрапеўты, тыя, хто пераадолеў хваробу. З цягам часу нашы пацыенты ўладкоўваюцца на працу, заводзяць сем'і, але ж працягваюць наведваць спецыяльныя заняткі ў групах. Справа ў тым, што пакуль ты разумееш, што хворы, ты вядзеш здаровы лад жыцця. Як толькі пачынаеш лічыць сябе здаровым — пачынаеш жыць, як звычайны чалавек. А ў жыцці звычайнага чалавека заўсёды ёсць месца слабасці, і ўсё пачынаецца наноў. Толькі тыя, хто больш за тры гады наведваюць цэнтр і паводзяць сябе бездакорна, лічацца ачунялымі. Сярод нашых пацыентаў такіх 40—60% — даволі высокі паказчык. Дзеля справядлівасці адзначу, што наркаманія, як і любая хвароба, мае рызыку ўзнаўлення. Пасля рэабілітацыі рэцыдывы назіраюцца ў 8% пацыентаў, без лячэння — у 92%.

■ Вазьму твой боль...




# ВЕКТАРЫ КАХАННЯ

**У Цэнтры дзіцячай анкалогіі, гематалогіі і імуналогіі лечацца падлеткі. Хвароба насцігае іх у час палавога выспявання, ва ўзросце, на які прыходзіцца першы досвед адносінаў. І яны не ўпускаюць магчымасці — наладжваюць іх паралельна лячэнню.**

І вы ведаеце, гісторыі мала чым адрозніваюцца ад нашых, паўсядзённых. Тыя ж матылькі ў жываце, тыя ж запісачкі, прагулкі, пацалункі і тыя ж любоўныя трохкутнікі. Ды іншыя не вядомыя геаметрыі фігуры.

Аліне спадабаўся Саша з дванаццатай палаты. Я бачу, як у яе загараюцца вочы, калі ён уваходзіць у гульнявы пакой. Саша дае нагоду Аліне думаць, што яе запал узаемны. Ён удзяляе ёй шмат увагі ў працэсе гульні, жартуе з яе, няўзнак дакранаецца. Але гэта толькі здаецца, што Саша адказвае Аліне ўзаемнасцю. У яго такая манера — неабачлівы флірт. Ён так і са мной сябе паводзіць. Яго сапраўдная захапленне — студэнтка-валанцёрка, якая прыходзіць сюды па выхадных. Яна вельмі прыгожая, вясёлая і асацыюецца ў Сашы з жыццём па-за межамі бальніцы. Ён заўважна бянтэжыцца, калі застаецца сам-насам з Ленай. І прызнаецца мне, што марыць запрасіць яе на спатканне. Я не сказала Сашу, што ён не мае шанцу. Навошта яму ведаць, што Лена безнадзейна закаханая ў дарослага мужчыну? Яна сустракаецца з аднагодкам свайго бацькі. У таго ёсць сям'я і недальнабачныя планы на Лену.

Ланцужок пачынаўся з Аліны. Калі яго развіваць у іншы бок, то магу вам па сакрэце паведаміць, што ў роднай вёсцы яе чакае хлопец. Аліна раней думала, што кахае яго. А цяпер дакладна вырашыла, што яны не пара, і ўсю сваю прывабнасць накіроўвае на Сашу з дванаццатай палаты...

Мы часта абвінавачваем «мыльныя оперы» ў залішнім «мыле». Сцэнарысты ў пагоні за рэйтынгамі плятуць неверагодныя павуцінне сюжэта, гублюючы сувязь з рэальнасцю. Але жыццё падкідвае такія шматтомныя раманы, што ніводнаму сцэнарысту падобнае ў галаву не прыйдзе!

Памятаю, як я сяджу ў сонечны дзень на лаўцы пасля чаргоўнага спаткання. Расчырванелая, замілаваная, з букетам ландышаў. Вакол — мітусня, гоман, смех. А я ў воблаку. Сяджу і не магу паверыць свайму шчасцю. У свеце каля сямі мільярдаў чалавек, і трэба ж так супасці, каб знайсці таго, чый вектар накіраваны ў твой бок! Супадзенне вектараў — гэта ўвогуле цуд, дар. Яго не зможа прадказаць ніякая тэорыя імавернасцяў. «Гэта... гэта... Як такое магчыма?» — быццам крычаў мой затуманены розум. А вектар кахання абвяргаў немагчымае.

Я ведаю жанчыну, якая ніяк не магла вызначыць кірунак свайго вектара і вельмі ад гэтага пакутавала. Яна была заўсёды ў цэнтры ўвагі мужчын, але ніхто не магла адказаць узаемнасцю. І вось у далёкай краіне выпадкова сустрэла старога знаёмага, які шмат гадоў быў побач і не выклікаў ніякіх эмоцый. Яна перагледзела свае погляды, адкрыла яго па-новай і... вектары кахання супалі.

Я ўсё яшчэ не наблізілася да разумення і разгадкі. «Як гэта магчыма?!» — шалее мой пасталелы мозг. З сямі мільярдаў асоб на 500 мільёнах квадратных метраў сустрэць свайго чалавека! Але гэта магчыма. І калі цуд здарыўся менавіта з вамі, агарніце яго сваім саюзам, вазьміце ў чатыры далоні і нясіце. Праз вецер і туман, праз побыт і спрэчкі, цераз дрот і калючы ядловец. Нават калі ён цяжкі і бракуе сіл ісці, заляжце на дно. Але разам. Разам са сваім дарам. Не прадайце яго, не размяняйце, не здрадзьце яму, не згубіце. Ён абвяргае немагчымае. І ён ваш.

**Таццяна НЕМЧАНІНАВА,**
**заснавальніца дабрачыннага руху «Клуб 5000»**

■

# «ДЗЕЦІ НАРАДЖАЮЦЦА НЕ ДЛЯ БАЦЬКОЎ»

## Пра магістратуру, Дубай і англійскую мову

**Колькі сябе памятаю, заўсёды любіла вучыцца.** Мяне цікавіць усё новае: ад нанатэхналогій да касмалогіі. Удзячная бацькам за цярпенне ў дачыненні да маіх нестандартных шляхоў атрымання адукацыі: я вучылася ў сямі ўніверсітэтах, як у Беларусі, так і за мяжой! Пачала з філалогіі, прадоўжыла міжнародным правам і менеджментам. Цяпер прафесійна прысвяціла сябе педагогіцы і псіхалогіі.

**Адукацыя праз усё жыццё** — гэта мая гісторыя. Я і цяпер з'яўляюся магістранткай. З задавальненнем сяджу за партай, слухаю цудоўных выкладчыкаў, атрымліваю асалоду ад пытанняў з аўдыторыі, кніг, якія нам рэкамендуюць. Вядома, лекцый цяпер значна менш, чым пры атрыманні вышэйшай адукацыі, бо асноўная задача — напісаць магістарскую работу. Гэта навуковая дзейнасць, глыбокае пагружэнне ў тэму адукацыі, выхавання дзяцей. Знаходжу там для сябе вельмі шмат цікавага, што паспяхова ўкараняю ў работу свайго клуба.

**Шчаслівыя дарослыя вырастаюць са шчаслівых дзяцей. Калі вы не можаце паказаць малечы прыклад таго, як будаваць добрыя адносіны, як паважаць адно аднаго, падтрымліваць, то лепш разысціся.**



**На стварэнне адукацыйнага клуба мяне натхніла дачка**, якой я хацела даць усё самае лепшае. Калі Мілане было 2 гадзікі, мы з ёй жылі ў Дубаі. Дачка каля года наведвала іх дзіцячы садок. І нягледзячы на тое, што знаходзілася там усяго 3 гадзіны ў дзень, ужо праз месяц я стала заўважаць, як лёгка яна кантактуе з дзеткамі па-англійску на пляцоўцы для гульні. Калі вярнулася ў Мінск, проста не знайшла тую школу ранняга развіцця для Мілашы, якая мяне задаволіла б.

**У першую чаргу**, ствараючы клуб, я глядзела на яго вачыма дзяцей: ці будзе ім тут утульна? Ці захочуць яны сюды вяртацца? Ці будзе ім цікава з гэтымі педагогамі? Ці атрымаюць яны патрэбныя ім веды і навыкі? На шчасце, я змагла стварыць утульны і пры гэтым карысны «другі дом» для дзяцей і іх бацькоў. Апошнія тут знаходзяць прафесійныя адказы на свае пытанні пра выхаванне і адукацыю сваіх крывіначак. У Мінску гэта першы двухмоўны клуб, першы з такім нестандартным падыходам да дзяцей і адукацыі.

**Развіццё адбываецца не па ўказцы дарослых** — дзіця развіваецца ў любой сітуацыі, у кожны момант часу. А вось стварыць умовы для найлепшага развіцця, акружыць малечу момантамі і сітуацыямі, калі яна можа даведацца новае, спрабаваць, задаваць пытанні, — у гэтым і ёсць сутнасць выхавання. На якой мове гэта будзе адбывацца, такую мову дзіця і будзе засвойваць. Гэта ж усяго толькі інструмент зносін, не больш за тое. Пачынаць вучыць замежныя мовы ніколі не рана, бо яны адкрываюць многія дзверы ў жыцці, у кар'еры. Таму мы развіваем і адукоўваем дзетак пачынаючы з 6-месячнага ўзросту па-руску, па-англійску і па-іспанску. Валодаючы толькі гэтымі трыма мовамі, чалавек можа размаўляць з палавой свету!

**Мы арыентаваны на бацькоў, якія думаюць** не меркамі «ну як ты паеў, сынок?» і «ці цёпла ты апрануўся?» Гэта не адукацыя, а догляд. Базавыя патрэбы дзіцяці і абавязак бацькоў. А што далей? Сучасны свет і цывілізацыя ў цэлым патрабуюць ад чалавека вельмі шмат. Стаць усебакова развітай асобай дазваляе адукацыя. Таму да нас ідуць бацькі, якія сапраўды цікавяцца сваім дзіцем: пра што яно думае, да чаго імкнецца.

**Перакананa, што дзяцей трэба развіваць** не толькі інтэлектуальна і фізічна. Абавязкова трэба прывіваць камунікабельнасць, густ і, самае галоўнае, чуласць і міласэрнасць. Па маім перакананні, войны і канфлікты ўзнікаюць у першую чаргу з прычыны адсутнасці ў людзей дабрыні, а не ведаў.

## Пра чужыя інтарэсы, дысертацыю і лесвіцу

**Калі чалавек не развіваецца**, ён дэградуе. «Жыццё — гэта лесвіца. Ты альбо караскаешся ўверх, або ідзеш уніз». Доўга думала над гэтай фразай. Чаму? А калі ты проста стаіш? І ўсвядоміла вельмі жыццёвую рэч: пакуль стаіш, ты апускаешся ўніз за кошт таго, што іншыя растуць. Таму, вядома, трэба развівацца. І рабіць дабро. Каб тваё жыццё прыносіла сэнс людзям вакол, а не толькі самому сабе.

**Страціць сябе можна** толькі ў тым выпадку, калі цябе няма. Я ведаю, што многія бацькі растварающа ў дзецях. Але мне здаецца, што гэта хутчэй сублімацыя: калі цябе самога няма, ты знаходзіш вонкавы рэсурс, у чым быць. Як, напрыклад, людзі, у якіх няма сваіх інтарэсаў, жывуць чужымі. Я лічу, што ў першую чаргу трэба быць самім сабой, тады ты зможаш і дзіцяці вельмі шмат даць. Нездарма кажуць: «Не выхоўвай дзяцей, усё роўна яны будуць падобныя на цябе. Выхоўвай сябе».

**Мая мама працуе выкладчыкам** ВНУ, з'яўляецца кандыдатам навук, абараняе доктарскую дысертацыю. Мяркую, што ад яе ў мяне любоў да кніг, вучобы, адукацыі. З дзяцінства я чула, як людзі казалі: «Якая ў цябе цудоўная мама, якая яна добрая, як яна смачна гатуе». У мяне быў бясконцы гонар. Для кожнага дзіцяці вельмі важна ганарыцца бацькамі, каб браць з іх прыклад.

**Дзіця нараджаецца не для бацькоў**, тым больш, не для вучобы дзеля вучобы. Яно нараджаецца для самога сябе.

**Я візуал.** Многае ўспрымаю вачыма. Магу назваць сябе эстэтам. У рэчах мне вельмі падабаецца лаканічнасць, мінімалізм, але пры гэтым якасць. Вельмі люблю прыгожыя творы мастацтва, прыгожых людзей. Прыгажосць для мяне — гэта гармонія. І ў першую чаргу гармонія асобы. Не разумею людзей, якія могуць усміхацца, але мець злы погляд, напрыклад. Таксама заўважаю ў першую чаргу ўчынкі, а не словы — што чалавек робіць, так ён і думае. І, канешне, вельмі цаню гарманічныя, прыгожыя адносіны. Як жанчына я прыйшла да гармоніі некалькі гадоў таму, калі мне пашчасціла сустрэць цудоўнага чалавека. Не ведаю, чым гэта патлумачыць, думаю, проста лёс падарыў. Кажуць, кожны з нас атрымлівае тое, што заслугоўвае. Калі б мы з ім пазнаёміліся гадоў 10 таму, я сама была б не гатова да сустрэчы з такім чалавекам. А пасля таго, што перажыла ў мінулых адносінах, пераасэнсавала многія рэчы і цаню тое, што маю.

**Па маім перакананні, войны і канфлікты ўзнікаюць у першую чаргу з прычыны адсутнасці ў людзей дабрыні, а не ведаў.**

**Я сапраўды ўвайшла ў лік 50 паспяховых і прыгожых мінчан.** Гэта свайго роду прызнанне, але не маё асабістае дасягненне. Я цаню хутчэй вынікі дзяцей, якія выступаюць на нашых ранішніках. Радуюся, калі шчаслівыя бацькі дзякуюць нашым выкладчыкам, кажучы, як цудоўна, што вы ў нас ёсць. Прафесійным дасягненнем лічу ўдзел у «круглых сталах», міжнародных канферэнцыях, куды мяне запрашаюць як эксперта ў сваёй сферы. І, канешне, цяпер мая самая галоўная задача — вярнуць дачцэ сапраўдную маму, якой яе пазбавілі на доўгі час. Гэта будзе адным з самых важных дасягненняў майго жыцця.

**Надзея ДРЫЛА.**
*dryla@zviazda.by*

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)***

Папрасіла Ілону дастаць любыя тры рэчы са сваёй сумачкі. Яна сказала, што заўсёды носіць з сабой **іконкі і фотаздымак дачкі**, але «гэта вельмі асабістае, таму я паказваць не хацела б».

Затым дастала **загорнуты ў паперу падарунак.** «Тут карціна, яе хачу падарыць чалавеку, з якім сёння ўбачуся. Я хлебасольная. Люблю радаваць сяброў. Калі некуды езджу, абавязкова вязу з сабой маленькія сувенірчыкі. Паколькі часцей за ўсё лётаю на самалёце, стараюся, каб яны былі лёгкімі. Як правіла, гэта беларускія цукеркі ці шакалад, ільняныя абрусы, сурвэткі. Вельмі прыемна ганарыцца сваёй краінай і яе прадукцыяй».

Трэці прадмет — **ноўтбук.** «Гэта для мяне і запісная кніжка, і сувязь са светам, і крыніца інфармацыі. Дзякуючы яму я не прывязана да офіса. Адчуваю сябе вельмі свабодным чалавекам, бо ў мяне заўсёды ёсць з сабой сродак сувязі, які дазваляе мне пісаць, чытаць, думаць, шукаць, кантактаваць, дзе б я ні знаходзілася».



Фота Надзеі БУЖАН.

# НЯСУМНЫ ДЭКРЭТ

**З'яўленне дзіцяці — гэта заўсёды новы этап, які многае мяняе ў звыклым жыцці сям'і. Але, круці не круці, большасць змяненняў тычацца менавіта мамы. 24 гадзіны ў суткі яна акружае маленькі цуд клопатам. Спачатку, ведаю не па чутках, на сябе зусім не застаецца часу, але паступова пачынаеш задумвацца пра ўласнае развіццё і, магчыма, дадатковы заробак. Вельмі часта на творчасць маладых матуляў натхняюць менавіта ўласныя дзеці.**





## ГІСТОРЫЯ ПЕРШАЯ. АСАБІСТАЯ

### «Спадабалася Ганульцы — спадабаецца і заказчыку!»

— Калі маёй Ганульцы споўнілася паўгода і амаль усе прыціркі, страхі і выпрабаванні скончыліся, я зразумела, што душа прагне часу для сябе — не проста папіць у цішыні гарбаты ці пачытаць кнігу, а зрабіць нешта больш значнае! Так я дастала з шафы швейную машынку, якую закінула падчас цяжарнасці (дзіўна, але тады мяне ванітавала ад адной думкі пра шыццё — з вялікай цяжкасцю дарабіла пялюшкі і шторы ў дзіцячы пакой. А набытая тканіна на бялізну для малой так і засталася некранутай). І вось дзіва — мне да дрыжыкаў хацелася шыць! Тым больш, год ляжаў нясконччаны мной двухметровы плед з абрэзкаў для лецішча. За некалькі дзён рознакаляровы прыгажун быў даведзены да ладу. Муж засцяліў ім канапу ў зале, сказаў, што ніколі не завязе яго на лецішча. А я пасля публікацыі фота ў сацыяльнай сетцы атрымала першы заказ.

Зараз шыю не толькі для сваёй дачушкі, але і для іншых дзетак: коўдрачкі-канверты на выпіску і ў калыску, пасцілкі ў стылі пэчварк, дэкаратыўныя падушкі, гірлянды-расцяжкі і іншыя прыемныя тэкстыльныя дробязі.

Ганулька з задавальненнем перабірае мае мяхі з тканінай, вельмі любіць пасядзець на гатовым вырабе. Лічу гэта за адзнаку якасці — пабегла сядзець — значыць спадабалася. Спадабаецца і заказчыку!





Сафійка ў маміным упрыгажэнні.



Марскі торцік.

## ГІСТОРЫЯ ДРУГАЯ

**Дар'я Вітко са Светлагорска, мама Сафіі:**

### «Са з'яўленнем дачкі пачала тварыць спецыяльна для яе»

— Я заўсёды нешта тварыла, пастаянна нараджаліся ў галаве новыя ідэі. Са з'яўленнем нашай Сафійкі я пачала ствараць прыгажосць адмыслова для яе.

Спачатку стала рабіць торцікі з масцікі — гэта ідэя прыйшла да мяне перад хрышчэннем дачкі. Захацелася зрабіць усё сваімі рукамі. А потым на кожнае свята і дні нараджэння родных я пякла прыгожыя прысмакі са згушчонкай і арэхамі, тваражком і ягадамі ў выглядзе соў, кароны прынцэсы, кветак...

Яшчэ адно з захапленняў — скрабукінг. Убачыла неяк у сацыяльнай сетцы цікавую скрыначку — «маміны скарбы». Яна прызначана для захоўвання памятных рэчаў малога. У іх складваюцца бірачкі з радзільні, пустышкі, тэсты з дзвюма палоскамі, раздрукоўкі ўльтрагукаў, першыя лыжачкі, першы зубік... І зноў жа вырашыла змайстраваць такую для сябе. Другая мая скарбніца была зроблена ў падарунак для пляменніка.

Кожная матуля, у якой ёсць дачка, марыць хутчэй завязваць ёй розныя хвосцікі і ўпрыгожваць банцікамі — і я не выключэнне. Як толькі зрабіла першую кветачку для Сафійкі, адразу з'явілася вялікая колькасць ідэй і захацелася іх увасобіць у жыццё. Цяпер актыўна раблю павязкі і заколкі з фетру. Тут у мяне і героі любімых дзявочых мульцікаў, і кексікі, і вушкі... Я толькі пачынаю, але рухацца ёсць куды! Дзякуй, родныя ўсяляк падтрымліваюць і, як строгае журы, ацэньваюць мае новыя творы. Нават падкідваюць ідэі для будучых упрыгажэнняў.

## ГІСТОРЫЯ ТРЭЦЯЯ

**Кацярына СІНКЕВІЧ з вёскі Камаі Пастаўскага раёна, мама Паліны і Даніка:**

### «Самае складанае было даказаць мужу, што мне гэта трэба»



— Падчас вучобы я і вышывала, і вязала. Потым усё было забыта і закінута. І вось сяджу неяк у чарзе па запаветны бальнічны ліст і мару — «гэта ж цэлыя 3 гады дома сядзець, можна ўсё-ўсё пераробіць» (наіўная). Я зноў стала вязаць, вязала ўсюды — і ў аўтобусе, і ў бясконца доўгіх чэргах у паліклініцы, і на дзіцячай пляцоўцы. І нават машынку швейную купіла сабе на дзень нараджэння.

Калі ж у доме расце прынцэса — немагчыма проста так сядзець і нічога не рабіць для падтрымання яе прыгажосці! Дачка — самы галоўны натхняльнік! Стварэннем упрыгажэнняў для валасоў пачала займацца крыху больш за год таму. Спачатку на адным з форумаў пазнаёмілася з дзяўчынкай, якая рабіла канзашы. Гэта традыцыйныя японскія ўпрыгажэнні, вырабляюцца з квадратных адрэзкаў тканіны ў тэхніцы «складанне». Я разглядала яе працы з зайздрасцю і наракала на сваю крываруказсць...

Калі ў садку рэгулярна пачалі губляцца гумкі для валасоў, я нарабіла Палінцы розных банцікаў з мульцяшнымі героямі. Радасці дзіцяці не было мяжы! Ну а потым адны знаёмыя папрасілі зрабіць падобныя, другія — пагалоска хутка разышлася па вёсцы.

Самае складанае было даказаць мужу, што мне гэта трэба. Не дзеля грошай, а для сябе. Быць чымсьці занятай акрамя штодзённай хатняй руціны. Праўда, ён да гэтага часу не можа прывыкнуць да маіх начных пасядзелак. Бывае надумаю якінебудзь праект, ночы 2-3 запар сяджу раблю. На раніцу адчытвае мяне як першакласніцу за гэта, але даруе.



Работы ў тэхніцы канзашы.

Не ўяўляю, як праходзіць дзень у чалавека, які нічым не захапляецца. Без хобі жыццё сумнае і аднастайнае. Бо гэта ж такое задавальненне — пакласці ўсіх спаць, а потым самой у цішыні пастукаць пруткамі! А навядзенне парадку ў сваіх запасах — гэта ж самы лепшы антыдэпрэсант. Сядзіш, перабіраеш пацеркі са стразамі — і няхай увесь свет пачакае.

— Па прафесіі я графічны дызайнер і, як многія мамы, апынуўшыся ў дэкрэце, шукала, куды ж накіраваць свой творчы патэнцыял. Вырашыла паспрабаваць свае сілы ў вязанні. Спачатку звязала шапку і шалік для дачкі і для сябе. Апублікавала фота першай карпатлівай працы ў інтэрнэце. Калі атрымала масу станоўчых каментароў ад сяброў, то ўжо не змагла спыніцца! Ды і родныя былі прыемна здзіўлены. Зараз вяжу, як дзіцячыя і дарослыя камплекты асобна, так і камплекты ў стылі family look.

## ГІСТОРЫЯ ЧАЦВЁРТАЯ

**Ганна ЗАЙКО з Мінска, мама Аліны:**

### «Калі ў руках пруткі, надыходзіць поўнае супакаенне»



Занятак мне гэты вельмі даспадобы. Калі ў руках пруткі, надыходзіць поўнае супакаенне. Вяжу ў асноўным пасля таго, як увечары пакладу дачку спаць, таму хапае часу займацца і дзіцем, і домам, і сабой. Аліна — мая маленькая мадэль. Амаль усе звязаныя рэчы я прымяраю на ёй — і яна першая ацэньвае мае работы.

Яшчэ адзін важны аспект, акрамя атрымання асалоды, — гэта фінансавы. Хоць прыбытак ад вязання больш намінальны (хапае на матэрыял ды сабе на касметыку), займацца любімым хобі хочацца і далей, тым больш, калі бачыш задаволеных кліентаў у сваіх прыгожых шапачках-шаліках.

Марына СІДАРОВІЧ, фота аўтара і з архіва герань.

# ОБЪЯВЛЕНИЕ О ПОВТОРНЫХ ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание) имущества и его стоимость** | **ЛОТ № 1. Шкаф металлический 172*23260 (2 шт.) стоимостью 6 917 400 бел. рублей. ЛОТ № 2. Летний бар стоимостью 10 843 200 бел. рублей. ЛОТ № 3. Кондиционер «Горизонт» 12Н-03 (4 шт.) стоимостью 7 851 600 бел. рублей** |
| **Собственник (владелец) имущества** | ООО «Здравствуй праздник» (УНН 391434526) |
| **Местонахождение (адрес) имущества** | г. Орша, ул. 1 Мая, 72 |
| **Наличие обременений** | нет |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | 17.02.2016 в 10.00 г. Орша, ул. Островского, 36, каб. 10 |
| **Справочная информация об организации торгов** | Отдел принудительного исполнения Оршанского района и г. Орши 211391, г. Орша, ул. Островского, 36 Судебный исполнитель Рожанская Кристина Викторовна, тел. (80216) 54 32 12, начальник отдела Федоненкова Наталья Сергеевна, тел. (80216) 54 32 13 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | **Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано:** 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет отдела принудительного исполнения Оршанского района и г. Орши 3642903000794 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 647, УНП 300002505, **не позднее 10 часов 16.02.2016 г.** Минимальная величина первого шага – 5% от первоначальной стоимости лота. В соответствии с частью 3 статьи 401 Хозяйственного процессуального кодекса Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется покупателем имущества. |

## Извещение о проведении аукционных торгов по продаже земельных участков в г. Бресте в частную собственность граждан Республики Беларусь

| № лота | Адрес участка | Кадастровый № 14010000000 | Общая площадь (га) | Целевое назначение использования участка | Начальная цена предмета аукциона (руб.) | Сумма задатка (руб.) | Расходы по подг. земел.-кадастр. док. (руб.) | Характеристика инженерных коммуникаций и сооружений на участке, в т.ч. ограничения и условия в его использовании |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | ул. Нестерчука, 56 | 1022887 | 0,1061 | Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома | **215 066 398** | 43 000 000 | **630 000** | ограничений в использовании земель нет |
| 2 | ул. Нестерчука, 62 | 1023288 | 0,1038 | | **210 404 261** | 42 080 000 | **630 000** | ограничений в использовании земель нет |
| 3 | пер. 2-й Бехтерева, 24 | 1025939 | 0,1009 | | **153 394 436** | 30 670 000 | **630 000** | ограничений в использовании земель нет |
| 4 | ул. Засима, 36 | 1023303 | 0,1000 | | **162 161 280** | 32 430 000 | **630 000** | ограничений в использовании земель нет |
| 5 | ул. Лыщицкая, 30 | 1024483 | 0,1036 | | **157 499 143** | 31 490 000 | **630 000** | ограничений в использовании земель нет |
| 6 | ул. Поплавского, 15/1 | 1027813 | 0,0901 | | **538 965 009** | 107 790 000 | **5 164 568** | ограничений в использовании земель нет |
| 7 | ул. Железнодорожная, 7/1 | 1027088 | 0,1304 | | **912 195 153** | 182 430 000 | **1 007 769** | 0,0049 га – охранная зона воздушной линии электропередачи напряжением до 1000 В |
| 8 | пер. Железнодорожный, 4-й, 21 | 1027087 | 0,1207 | | **844 340 145** | 168 860 000 | **1 323 994** | ограничений в использовании земель нет |

**ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ – КУП «БРЕСТСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР ПО УПРАВЛЕНИЮ НЕДВИЖИМОСТЬЮ»**

**Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже земельных участков в частную собственность, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 №462,** и состоится при наличии не менее двух участников. В аукционе могут участвовать граждане Республики Беларусь.

**Перечень документов, представляемый участником аукциона**: заявление на участие в аукционе; документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков); **гражданином** – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; **представителем гражданина** – нотариально удостоверенная доверенность. При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

**Лицо, желающее принять участие в аукционе**, **обязано** подписать с организатором торгов Соглашение, определяющее взаимные права и обязанности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Порядок осмотра объекта осуществляется участником аукциона по согласованию с организатором торгов.

**Задаток перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на р/с № 3012780360011 в филиале № 100 Брестское областное управление ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Бреста, код 246, УНП 290433924**.

**Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%, обязан:**

• в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся в размере, определенном соответствующим протоколом аукционных торгов, осуществить оплату за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения в установленном порядке), возместить расходы, понесенные городским бюджетом по подготовке земельно-кадастровой документации и государственной регистрации земельного участка, а также компенсировать организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения (окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников). Оплата цены продажи предмета аукциона может быть осуществлена в рассрочку, в соответствии с решением Брестского горисполкома от 15 мая 2008 г. № 881;

• в течение 2 месяцев со дня получения выписки из решения горисполкома об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона обратиться за государственной регистрацией права частной собственности на земельный участок;

• получить в установленном порядке техническую документацию и разрешение на строительство объекта;

• приступить к освоению земельного участка в течение шести месяцев (для юридических лиц) и в течение одного года (для граждан) со дня получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на него в соответствии с целью и условиями его предоставления (начать строительство), при этом срок подготовки проектной документации на строительство объекта с учетом ее государственной экспертизы не должен превышать два года;

• снять на занимаемом земельном участке плодородный слой и использовать его согласно проектной документации;

• обеспечить содержание приобретенного земельного участка в надлежащем санитарном и техническом состоянии (самостоятельно или путем заключения договора со специализированной организацией г. Бреста).

**Аукцион состоится 3 марта 2016 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Энгельса, 3, (каб. 607).**

**Заявки на участие в аукционе принимаются с 8.30 28.01.2016 г. до 17.30 26.02.2016 г. (перерыв с 13.00 до 14.00; вых.: суб., вс.) по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 50.**

**Контактные телефоны: 53 81 92, 53 45 65. Сайты: www.bgcn.by, www.city.brest.by и www.gki.gov.by**

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА ДЛЯ СТРОИТЕЛЬСТВА И ОБСЛУЖИВАНИЯ ОДНОКВАРТИРНОГО ЖИЛОГО ДОМА В БОБРУЙСКОМ РАЙОНЕ

| Номер лота по порядку | Местоположение земельного участка | Начальная цена (руб.) | Размер задатка (руб.) | Расходы, связанные с подготовкой аукциона и документации, необходимой для его проведения | Условие проведение аукциона | Характеристика земельного участка | Кадастровый номер | Инженерная и транспортная инфраструктура | Дата проведения аукциона | Последний день приема заявлений |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Бобруйский район, Сычковский сельисполком д. Щатково, пер. 3-й Масловского, 12 | 11 111 159 | 1 111 116 | 15 639 254 (расходы возмещает победитель аукциона) | Наличие не менее двух участников | Площадь 0,1214 га | №720884012601000222 | - | 29.02.2016 г. | 23.02.2016 г. до 17.00 |

**ПРИМЕЧАНИЕ:** Аукцион состоится в 15.30 по адресу: г. Бобруйск, ул. Пушкина, 215-а, 2-й этаж, малый зал заседаний. Заявления принимаются по адресу: г. Бобруйск, ул. Пушкина, 215-а, каб. 61, в рабочие дни с 08.00 до 17.00 с 1-го дня после публикации извещения в СМИ. Информация о земельных участках по контактному телефону в г. Бобруйске: 72-05-40, 71-74-30.

Для участия в аукционе гражданин Республики Беларусь (лично или через своего представителя) в установленный в извещении о проведении аукциона срок обязан предоставить следующие документы в комиссию по проведению аукционов:

- заявление на участие в аукционе (с указанием кадастрового номера и адреса земельного участка);

- *заверенную копию платежного поручения о внесении задатка (10% от начальной цены) на расчетный счет Сычковского сельисполкома №3600712110013 в АСБ «Беларусбанк» филиал 703, код 760, УНН 700045734, код платежа 04901;*

- представителем гражданина Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность;

- при подаче документов на участие в аукционе граждане предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Порядок проведения аукциона:

1. К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в указанные в извещении сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении расчетный счет задаток.

2. Первая объявленная аукционистом цена предмета аукциона определяется в соответствии с шагом аукциона. Торги продолжаются до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднял только один участник аукциона. Аукционист называет последнюю цену и номер данного участника трижды и объявляет проданным предмет аукциона словом «продано», а участника аукциона – победителем в отношении соответствующего предмета аукциона.

3. При отсутствии лиц из участников аукциона, готовых выкупить предмет аукциона по названной цене, аукционист называет эту цену три раза. Аукцион завершается, если после трехкратного объявления новой цены предмета аукциона ни один из участников аукциона не поднял своего номера.

4. Предмет аукциона снимается с аукциона по решению комиссии или организации до начала проведения аукциона в случае отсутствия участников аукциона либо если на объект аукциона претендует только один гражданин.

В течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона победитель аукциона обязан внести плату за земельный участок, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка.

Всем желающим предоставляется возможность предварительного ознакомления с объектом.

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ С УСЛОВИЯМИ на право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) в г. Бресте

| | Право на заключение договора на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий и сооружений) на земельном участке | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **Предмет аукциона** | **лот №1** | **лот №2** | **лот №3** | **лот №4** | **лот №5** | **лот №6** |
| | по ул. Карла Маркса, 90, 92 и 94 на земельном участке площадью 0,1671 га | на пересечении ул. Менжинского, 3 и ул. Салтыкова-Щедрина на земельном участке площадью 0,4703 га | по ул. Свято-Афанасьевской в г. Бресте на земельном участке площадью 0,1000 га | по ул. Лейтенанта Рябцева, 84/1 в г. Бресте на земельном участке площадью 0,1500 га | по ул. Мицкевича в г. Бресте на земельном участке площадью 0,2128 га | по ул. Пионерской, 30 в г. Бресте на земельном участке площадью 0,56 га |
| **Функциональное назначение земельного участка** | строительство объекта общественного питания и торговли | строительство объекта торгово-административного назначения | строительство блокированного жилого дома | строительство блокированного жилого дома | строительство объекта общественного питания | строительство многоквартирного жилого дома со встроенными торгово-офисными помещениями на 1 этаже |
| **Вещное право предоставляемого земельного участка** | **в аренду сроком 5 лет** | **в аренду сроком 5 лет** | **в собственность негосударственного юридического лица Республики Беларусь** | **в собственность негосударственного юридического лица Республики Беларусь** | **в аренду сроком 10 лет** | **в аренду сроком 5 лет** |
| **Объекты недвижимости, подлежащие сносу** | жилые дома граждан по ул. Карла Маркса, 92 и 94 | жилой дом граждан по ул. Менжинского, 3 | здание и сооружения Отдела культуры Брестского горисполкома | здание и сооружения КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» | объект недвижимости КПУП «Брестводоканал» | здание КУП «ЖРЭУ г. Бреста» |
| **Снос объектов недвижимости производится в установленном законодательством порядке. Объекты расположены в районах с развитой инженерной инфраструктурой** | | | | | | |
| **Начальная цена продажи (руб.)** | **506 361 413** | **1 283 652 392** | **212 836 680** | **418 233 780** | **932 983 118** | **886 088 200** |
| **Сумма задатка (руб.)** | 101 270 000 | 256 730 000 | 42 560 000 | 83 640 000 | 186 590 000 | 177 210 000 |
| **Расходы по подготовке градопаспорта, земельно-кадастровой документации, тех.условий, АПЗ (руб.)** | 24 018 128 | 10 943 936 | 17 079 399 | 13 499 875 | 22 924 699 | 55 450 090 |
| **Ориентировочный размер убытков, причиняемых изъятием земельных участков и сносом расположенных на них объектов недвижимости, возмещаемый победителем аукциона землепользователям (руб.)** | **1 492 139 000** *(на 27.05.2014 г.)* Сумма фактического размера убытков будет рассчитываться на этапе отвода земельного участка, при этом дом по ул. Карла Маркса, 90 после отселения будет переведен в состав нежилого фонда и оценен по рыночной стоимости | **512 550 000** *(на 28.06.2014 г.)* | **88 085 701** *(на 05.03.2015 г.)* | **191 474 062** *(на 09.11.2015 г.)* | **644 272 000** *(на 09.11.2015 г.)* | **156 617 875** *(на 09.11.2015 г.)* |

**Дополнительные условия продажи для победителя аукциона: по лоту №1 –** при изъятии земельного участка по ул. Карла Маркса, 92 в г. Бресте возмещение убытков землепользователю в виде предоставления в собственность квартиры типовых потребительских качеств из расчета не менее 15 кв. метров на собственника и на каждого члена его семьи, зарегистрированного по месту жительства и осуществление в течение 10 рабочих дней с даты подписания протокола о результатах торгов компенсации расходов КУП «Брестское ДЭП» по ликвидации последствий чрезвычайной ситуации (пожара) в размере 52 022 090 рублей; **по лотам №1–6** обеспечить содержание приобретенного земельного участка в надлежащем санитарном и техническом состоянии (самостоятельно или путем заключения договора со специализированной организацией г. Бреста)

**ОРГАНИЗАТОР ТОРГОВ – КУП «БРЕСТСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР ПО УПРАВЛЕНИЮ НЕДВИЖИМОСТЬЮ»**

**Условия продажи:**

Земельный участок будет предоставляться победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, выразившему согласие на предоставление ему предмета аукциона (по лотам №1 и №2 в аренду сроком на 5 лет, а по лоту 3 в собственность негосударственного юридического лица Республики Беларусь) для строительства и обслуживания объекта, на основании решения Брестского горисполкома об изъятии и предоставлении земельного участка, при соблюдении следующих условий:

- в день проведения аукциона будет подписан акт выбора места размещения земельного участка;

- в установленном порядке будет заключен с проектной организацией договор на разработку проектной документации на строительство объекта (с выделением при необходимости отдельных этапов) с учетом ее государственной экспертизы в срок, не превышающий двух лет, со дня утверждения акта выбора места размещения земельного участка;

- в срок, не превышающий одного года со дня утверждения акта выбора места размещения земельного участка, будет предоставлен в ДУП «Проектный институт Брестгипрозем» генеральный план объекта строительства с проектируемыми инженерными сетями, разработанный в составе проектной документации – архитектурного проекта или утверждаемой части строительного проекта, с учетом прохождения в установленном порядке согласования в управлении архитектуры и градостроительства Брестского горисполкома, и заключен договор подряда на разработку проекта отвода земельного участка под объект строительства;

- в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона на р/с городского бюджета будут внесены суммы платежей, отраженных в протоколе о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся в размерах, определенных соответствующим протоколом аукционных торгов в счет оплаты за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения в установленном порядке) победителем аукциона – в размере цены продажи, сформированной по результатам аукциона, а единственным участником – в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов, и компенсации расходов, понесенных городским бюджетом, по подготовке градостроительного паспорта, земельно-кадастровой документации, архитектурно-планировочного задания и технических условий на размещение объекта;

- до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка, подписания договора на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений), а также договора аренды земельного участка будут выполнены условия, предусмотренные в решении об изъятии и предоставлении земельного участка.

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона обязан приступить к освоению (занятию) земельного участка в течение шести месяцев со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство объекта в соответствии с целью и условиями его предоставления (начать строительство объекта).

**Аукцион проводится в соответствии Положением о порядке организации и проведения аукциона с условиями на право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений), утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 №462, и состоится при наличии не менее двух участников.** В аукционе могут участвовать юридические лица и индивидуальные предприниматели.

**Перечень документов, представляемый участником аукциона:** заявление на участие в аукционе; документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков); **юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем** – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; **иностранным юридическим лицом** – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык**; представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель)** – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

Порядок осмотра предмета аукциона (лота) осуществляется участником аукциона по согласованию с организатором торгов.

**Лицо, желающее принять участие в аукционе, обязано** подписать с организатором торгов Соглашение, определяющее взаимные права, обязанности и ответственность сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

**Задаток перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на р/с № 3012780360011 в филиале № 100 Брестское областное управление ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Бреста, код 246, УНП 290433924.**

В случае признания участника победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона, выразившим согласие на предоставление ему предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, данное лицо обязано в течение 10 рабочих дней с даты проведения торгов **возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников.**

**Аукцион состоится 3 марта 2016 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Энгельса, 3, каб. 607.**

**Заявки на участие в аукционе принимаются с 8.30 28.01.2016 г. до 17.30 26.02.2016 г. (перерыв с 13.00 до 14.00; вых.: суб., вс.) по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 50.**

**Контактные телефоны: 53 81 92, 53 45 65.**

**Сайты: www.bgcn.by, www.city.brest.by и www.gki.gov.by**

■ Бывай, горад!

# НЕ ЖЫРУЕМ, АЛЕ І НЕ ГАРУЕМ

## Як мінчане вучыліся на вёсцы гаспадарыць

**Практыкавацца прымаць роды ў свінні, выпойваць малаком з соскі нованароджаных парасят, вырошчваць бройлерных курэй і шмат іншага давялося сям'і Кузьменкаў, якая пераехала са сталіцы жыць і працаваць у вёску Любанічы, што ў Карэліцкім раёне.**



**Авечая гаспадарка ў Святланы і Дзмітрыя вельмі палахлівая і бліжэй не падпускае.**

### ЗЯМЛІ МАЛА, ПАКУЛЬ НА ЁЙ НЕ ПРАЦУЕШ

Ва ўласнасці ў Святланы і Дзмітрыя тры ўчасткі памерам каля 75 сотак, на якіх вырошчваецца розная гародніна, а таксама гадуецца жывая гаспадарка: свінні, авечкі ды куры. У прасторнай хаце плошчай больш за 100 метраў, вялізная печка... Але ж усе выгоды на вуліцы, а рамонт будынка ды хлявоў пастаянна «пад'ядае» грошы, зробленыя на гародніне.

**«Мы забралі парасят у хату, наслалі на падлогу сена, паілі з соскі кожныя тры гадзіны. Аднаго корміш — астатнія пішчаць — вэрхал!»**

*— Бульбу прадалі — плітку купілі на падлогу ў кухні, парсючкоў здалі — цэмент набылі. Едзеш і думаеш: у Мінск цэлую машыну гароднiны вёз, а назад — яна ў дзве скрыні плітачакператварылася. І колькі ні працуй — ніколі не будзе скончана ўсё поўнасцю,* — разважае Дзмітрый.

Тым не менш сям'я працягвае «заваёўваць» вёску. Веранду перарабілі, памянялі вокны, абшылі сайдынгам пакой. Нядаўна вось бойлер з халоднай ды гарачай вадой у хаце ўсталявалі. Цяпер гаспадыня марыць пра душавую і падумвае, ці не завесці карову.

Ідэя змяніць горад на вёску прыйшла да мінчан даўно, і рыхтаваліся да пераезду яны не адзін год. Шмат ездзілі па Беларусі, прыглядаліся да працы сяброў-фермераў. У Любанічы наведаліся да знаёмай часта, глядзелі хаты, шукалі будынак, як мінімум на тры пакоі, каб гасцей можна было прымаць. Урэшце ўпадабалі адзін з варыянтаў, набылі ўчастак, а побач — яшчэ адзін, з меншай хатай, каб у ёй размяшчацца, пакуль рамантавалі асноўнае жыллё. Неўзабаве яшчэ і трэці надзел купілі.

*— Чым цяжэй было жыць у горадзе, тым часцей прыходзіла ў галаву думка, што трэба з'язджаць на вёску, каб вальней сябе адчуваць,* — расказвае Святлана. — *У нас з Дзімам у кожнага ў Мінску было ва ўласнасці толькі па частцы кватэры. Жыць давялося разам з сем'ямі сясцёр. Аб'яднаць метры ў адно жыллё не атрымоўвалася, адносіны паміж шматлікімі родзічамі і іх інтарэсы не супадалі. Затое цяпер замест 12-метровага пакойчыка і 6-метровай агульнай кухні ў нас прасторная хата і вялікая кухня-сталовая.*

Дарэчы, частка ў адной з кватэр у сям'і засталася ва ўласнасці — Святлана не хоча пазбаўляць дачку магчымасці знайсці сябе ў сталіцы.

*— Гаспадаранне на зямлі — гэта вам не рэкламная відэастужка, у якой чалавек паехаў на рыбалку, упадабаў прыгожыя мясціны, прадаў кватэру ў сталіцы, купіў хату на вёсцы і жыве ў сваё задавальненне, а праца сама спорыцца. Мы дагэтуль яшчэ вучымся, спрабуем, корпаемся,* — кажа Дзмітрый.

*— Мне спачатку ўсё здавалася, што зямлі мала. Думала, ну што тут можна вырасціць на гэтых 25 сотках. А як прыйшоў час усё гэта апрацоўваць, палоць, паліваць, я зразумела, што зямлі насамрэч у нас хапае,* — смяецца Святлана.



**Вялікая хата патрабуе вялікіх укладанняў.**

### БУЛЬБЯНАЯ АРЫФМЕТЫКА

Маючы за плячыма вопыт перапродажу гародніны на гарадскіх рынках, Кузьменкі планавалі вырошчваць уласныя бульбу, гарбузы ды моркву, зарабляючы гэтым на жыццё. Нават арандавалі ў калгаса дадатковыя плошчы на полі. Ледзьве не 15 сотак у гаспадарцы былі занятыя пад кабачкамі ды гарбузамі, каля 20 — засеяны пшаніцай, якая дала больш за тону збожжа на корм курам.

**«Я некалькі гадзін папалю, і ў мяне паясніца колам становіцца — іду адляжацца. Рвуся дагнаць па хуткасці мясцовых бабуль, але не паспяваю і нервуюся ад гэтага».**

*— Мы ехалі сюды, бо даўно ўжо зразумелі, што ў сучасных умовах выжывае вытворца, а не перакупшчык,* — тлумачыць Дзмітрый. — *Раней, каб зарабіць, вымушаны быў ставіць кошт вышэйшы, чым той, за які я тавар набыў. А зараз я канкурэнтаздольны, бо магу вар'іраваць цану. Тым больш што мы займаемся сартавой бульбай з дарагога насення і атрымоўваем прыгожы і добры ўраджай. Пакуль саджалі бульбу — суседзі каментавалі: «Навошта так рана — яшчэ не час». А як убачылі, што мы ўжо капаем, а ў іх толькі ўсходы — сталі глядзець па-іншаму.*

Тым не менш, як адзначаюць гаспадары, зарабіць хоць якую сур'ёзную суму можна толькі на продажы ранняй бульбы, бо за апрацоўку поля ім прыходзіцца плаціць калгасу столькі, што позняя ледзьве пакрывае гэтыя расходы.

*— Сёлета за апрацоўку соткі з нас бралі па 100 тысяч рублёў. Спачатку мы хацелі здаваць ураджай мясцовым перакупшчыкам, але ўбачылі, што танней пакінуць яго ў зямлі, чым выкопваць. На кірмашы ў Мінску сёлета бульба 3000 каштавала, а тут яе за 1500 забіралі.*

Атрымаўшы пэўны досвед і «бонус» у выглядзе 10 тон дробнай бульбы на ежу жывёлам, вясной Кузьменкі збіраюцца пасадзіць яе зусім рана, накрыўшы плёнкай, каб сабраць сапраўды скараспелку.

Вырашылі Святлана з Дзмітрыем паспрабаваць сябе і ў жывёлагадоўлі: купілі парасят, завялі авечак ды курэй. Не маючы практыкі ды вопыту, яны слухалі парады ўсіх, усё выконвалі і спрабавалі. Як вынік — незлічоныя здарэнні. То свіння ягнят з'ела, то ад парасят адмовілася...

Вопытным шляхам, напрыклад, зразумелі, што мець сваю свінаматку выгадней, чым штогод купляць парасят.

*— Два парсючкі каштуюць мінімум 2,5 мільёна, а калі бярэш іх дзясятак, гэта 12,5. Плюс грошы на ежу для іх. У выніку, калі прыходзіць час іх калоць, то выручанымі ад продажу мяса грашыма ўдаецца проста вярнуць тыя сродкі, якія ты на працягу года ўкладаў у іх адкорм — іншымі словамі, гэта год бясплатнай працы. Тады мы пакінулі сабе свінаматак, і зараз яны аплачваюць сваё харчаванне парсючкамі,* — смяецца Дзмітрый.

*— Першыя дзве свінаматкі прынеслі 21 парася, з якіх мы выратавалі толькі дваіх,* — успамінаюць гаспадары. — *У адной малака не аказалася, а другая адмовілася ад парасят. Мы забралі іх у хату, наслалі на падлогу сена, паілі з соскі кожныя тры гадзіны. Аднаго корміш — астатнія пішчаць — вэрхал! Аднак усё роўна большасць з іх не выжыла.*

*— Затое цяпер мы ўмеем і роды прымаць, і выкормліваць,* — жартуюць яны. — *Зразумелі, што нельга занадта лезці да жывёл, каб не нарабіць бяды. Усё павінна адбывацца, як прырода задумала. Практыкаваліся таксама куранят выводзіць. Паклалі ў інкубатары 400 яек — з іх вывелася каля 300 птушанят, аднак яны чамусьці пачалі паміраць. Пасля яшчэ і нейкі звер завёўся, ласавацца імі пачаў. Так што курыная гаспадарка ў нас пакуль невялікая, каля двух дзясяткаў.*



**Разам і праца спорыцца.**

### ЯК ДАГНАЦЬ БАБУЛЮ...

Пра сваё вясковае жыццё Святлана і Дзмітрый расказваюць з гумарам і нязгасным імпэтам. Перажываюць толькі, што дні тут вельмі хутка ляцяць. Нават на арэлях-канапе, якія паставілі ў двары ледзьве не ў першую чаргу, гушкаліся толькі пару разоў за два гады — завіханні па гаспадарцы займаюць увесь час. А Святлана ніяк не можа ўгнацца на прапалцы за суседкамі.

*— Пакуль такое адчуванне, што мы спрабуем бегчы ў розныя бакі, каб усё паспець. Толькі возьмешся за адну справу, як бачыш, што другая недаробленa, за яе схопішся — яна ў трэцюю перарастае, а за гэты час ты ўжо пра першую забылася і чацвёртую пачала...* — і смяецца, і перажывае Святлана. — *Здаецца, і шмат зрабіў за дзень, і натупаўся так, што ног не чуеш, а разам з тым і недаробленага шмат. Я некалькі гадзін папалю, і ў мяне паясніца колам становіцца — іду адляжацца. Рвуся дагнаць па хуткасці мясцовых бабуль, але не паспяваю і нервуюся ад гэтага. Вось і кроп з цыбуляй да зімы на раннюю зеляніну не высадзіла, і дроў нагатавана не столькі, як планавалася.*

*— Не паспяваем шмат, гэта факт,* — пагаджаецца Дзмітрый. — *Вёска — гэта ж адвечнае «трэба». А мне ўсяму вучыцца прыходзіцца, бо навыкаў няма практычных. Тую ж сцяжку на падлогу спецыяліст за тры гадзіны зрабіў бы, а я тры дні корпаюся.*

**«Чым цяжэй было жыць у горадзе, тым часцей прыходзіла ў галаву думка, што трэба з'язджаць на вёску, каб вальней сябе адчуваць».**

Першае знаёмства з суседзямі ў Святланы і Дзмітрыя нагадвала анекдот:

*— Мы толькі першы год як набылі хату, прыехалі ў маі, а насення кветачак прывезла, думаю, зараз як упрыгожу тут усё! А наш надзел уся поўнасцю суседзі засеялі, ледзьве не пад самую хату, ні соткі зямлі не пакінулі. Пытаемся: «Што гэта?» А нам: «Ну, мы гэтай зямлёй даўно карысталіся, чакалі вас, падумалі, вы не прыедзеце, дык мы і засеялі».*

*— Не скажаш, што мы гаруем, але і не жыруем. Не збіраемся адмаўляцца ад працы на вёсцы, тым больш што мы тут самі сабе гаспадары. Хоць гэта і цяжка, аднак пакуль атрымліваем задавальненне. Вось парасяты нарадзіліся — і ты ўжо ў захапленні ад таго, якія яны маленечкія ды прыгожыя!* — кажуць Кузьменкі. — *Галоўнае, навучыцца пазбягаць дарэмнай працы, каб быў здабытак і магчымасць утрымліваць сябе і гаспадарку.*

**Ірына СІДАРОК.**
**Фота аўтара**

■

■ Фотаздымак з гісторыяй

# КАХАННЕ І ВЕЧНЫ БОЛЬ

**Думаю, не памылюся, калі скажу, што нашы продкі перанеслі за сваё жыццё столькі пакут і нягод, што сённяшняму пакаленню з лішкам хапіла б на некалькі жыццяў. Хачу расказаць пра сваю бабулю Агаф'ю.**

...Нарадзілася яна ў другой палове XIX стагоддзя на Любаншчыне. Дзяцей у сям'і было шмат, а зямлі — мала.

У 17 гадоў дзяўчына выйшла замуж. За Фёдара, хлопца з такой жа беднай сям'і. Адно суцяшала маладых — каханне было ўзаемным, сапраўдным.

Неўзабаве нарадзіўся жаданы сын — назвалі Макарам. Жыць было вельмі цяжка, ледзь канцы з канцамі зводзілі. Заставалася толькі адно выйсце — ехаць на заробкі, каб затым купіць у пана зямлю.

І вось, сабраўшы няхітрыя пажыткі, Фёдар падаўся за акіян, у Амерыку. Праз год Агаф'я атрымала ад яго чаканае пісьмо. Пісаў, што ўжо працуе на заводзе і прасіў прыехаць да яго з сынам. Агаф'я замітусілася, пачала збірацца ў далёкую дарогу. Але нечаканая паездку давялося адмяніць. У вёсцы было некалькі мужчын, якія ўжо пабывалі ў Амерыцы і вярнуліся назад. Яны і сказалі жанчыне, што калі яна паедзе з малым, то той не перанясе такой цяжкай дарогі — загіне.

Так і засталася мая бабуля на сваёй малой радзіме з маленькім Макарам.

Неўзабаве пачалася Першая сусветная вайна, затым рэвалюцыя — новыя пакуты і нягоды давялося звездаць Агаф'і. Праз 10 гадоў, у 1922 годзе, не дачакаўшыся Фёдара бабуля другі раз выходзіць замуж — за былога франтавіка аднавяскоўца Цімафея. Нараджаюцца яшчэ тры дачкі.



Мая бабуля Агаф'я з дочкамі Лідзіяй (злева) і Марыяй, 1961 год.

Пачалі, як кажуць, паціху станавіцца на ногі. Ды надарылася новая бяда. Муж бабулі Цімафей вазіў зімой на кані сена і ўпаў з воза на лёд. Адбіў ныркі, затым адняліся ногі. Цэлы год бабуля даглядала яго. Вясной 1933 года Цімафей памёр.

Усе клопаты пра маці і трох сясцёр узяў на сябе Макар. Неўзабаве ён ажаніўся з мясцовай дзяўчынай Надзяй, нарадзілася дачка Лідзія. А тут новая страшная бяда — пачалася вайна. Макар пайшоў на фронт...

Пачаліся жудасныя дні акупацыі. Паколькі бабуля жыла на хутары недалёка ад лесу, то да яе часта прыходзілі партызаны. Яна разам з дочкамі пякла для іх хлеб, мыла бялізну. Усё гэта рабілася глыбокай ноччу. На вуліцы пастаянна хтосьці з дачок стаяў на варце, на выпадак нечаканага з'яўлення немцаў або паліцаяў.

Удзень яны часта прыходзілі, забіралі ўсё дачыста...

Затым пачаліся нечаканыя аблавы. Моладзь хапалі і адпраўлялі ў Германію на працу.

...Вёску акружылі а 6-й раніцы. Агаф'я, падаіўшы карову, выйшла з хлява. І тут убачыла, што да яе на хутар ідуць тры фашысты. Хутка разбудзіўшы дачок, загадала ім тэрмінова хавацца. Мая маці з сястрой Марыяй прыталіся пад саломай у хляве. Малодшая дачка Вольга адразу разгубілася, пасля хутка залезла па лесвіцы на паддашак дома, паспела толькі схавацца за комін. Фашысты агледзелі хлеў, папаролі штыкамі салому, затым адзін пачаў падымацца па лесвіцы на паддашак. Пагледзеў — пуста. Спусціўся ўніз. За комінам ні жывая ні мёртвая засталася стаяць худзенькая Вольга. Назаўтра бабулю выклікалі ў камендатуру.

Бялявы эсэсавец, паказаўшы ёй тры пальцы, спытаўся: «Дзе тры дачкі схавала, старая ведзьма, адказвай!?» Канешне, Агаф'я маўчала. Затым яе да паўсмерці збілі гумавай палкай і выкінулі на вуліцу.

Але на гэтым пакуты бабулі не скончыліся. Праз тыдзень фашысты сагналі жанчын за вёску, запрэглі ў барану і загадалі цягнуць па дарозе. Напярэдадні на партызанскіх мінах падарвалася некалькі іх машын з салдатамі. Гэтым разам Бог збярог маю бабулю. Партызаны, ведаючы пра акцыю карнікаў, паспелі зняць міны. Пачалі ставіць іх далей ад вёсак, каб не падвяргаць жыхароў небяспецы.

...Летам 1944 года пачалося масавае адступленне фашыстаў. Спачатку праз вёску адступалі немцы, на наступны дзень — іх прыслужнікі паліцаі.

Калі ўжо фронт у асноўным прайшоў, у двор хутара зайшоў малады немец у форме ягрэйтара. Убачыўшы бабулю, папрасіў папіць. Яна вынесла яму кубак вады, кавалак хлеба і сала.

«Данке, данке!» — пачаў лапатаць салдат.

Затым спытаўся: «Дзе тут рускія? Хачу здацца».

Бабуля вывела яго з двара, паказала на дарогу, дзе грукаталі савецкія танкі: «Ідзі з Богам!»

Салдат кінуў у кусты аўтамат, падняў рукі і пайшоў.

...Макар у лістападзе 1944 года прыслаў з Польшчы апошняе пісьмо. Ён ваяваў танкістам. Затым прыйшоў казённы ліст са стандартным надпісам: «Прапаў без вестак». Гэта быў самы цяжкі ўдар для Агаф'і...

Ужо 53 гады, як не стала маёй бабулі. Калі я бываю ў Любані, заўсёды стараюся наведаць гарадскія могілкі. Там, пад стагадовай сасной, магіла Агаф'і. На сціплым помніку просты надпіс: «Раба Божая, Вашчыла Агаф'я, памерла ў 1962 годзе».

А дзесьці там, за Атлантыкай, на іншым кантыненце, знаходзіцца магіла Фёдара — першае каханне і вечны боль маёй бабулі.

...Надзея, жонка Макара, усё спадзявалася, што муж вернецца, бо прапаў жа без вестак, можа, жывы — цеплілася надзея... Чакала з вайны бацьку і яго адзіная дачка Лідзія...

Абедзве ўжо пайшлі з гэтага свету, не дачакаўшыся любага чалавека. Засталася толькі праўнучка Фёдара Любоў, якая жыве ў Мінску. Яна не страчвае надзеі, пачала ўзмоцнена займацца пошукамі сваіх каранёў у далёкай Амерыцы. А раптам хто адгукнецца, няхай нават на іншай мове, бо гэта не так важна, родныя зразумеюць адно аднаго і без слоў.

**Міхаіл МАСКАЛЬЧУК,**
*г.п. В. Бераставіца, Бераставіцкі раён*

***Шаноўныя чытачы! Конкурс «Фотаздымак з гісторыяй» працягваецца. Мы па-ранейшаму чакаем ад вас цікавых фота з сямейнага альбома (за выключэннем леташніх здымкаў з курорта, вясельных фотасесій і сучасных фота дзяцей). Вам ёсць што паказаць і расказаць? Давайце пагартаем сямейныя альбомы разам! Фотаздымкі (не больш за тры) з гісторыяй дасылайце з адпаведнай пазнакай на адрас: 220013, г. Мінск, вуліца Б. Хмяльніцкага, 10а або info@zvyazda.minsk.by. Найлепшага аўтара чакае прыз. Арыгіналы дасланых фотаздымкаў абавязкова вяртаюцца.***

■ Кемлівым дзеткам

**...прысвечаны наш новы праект. Мы хочам стварыць чароўную скарбонку, адкуль нашы дапытлівыя хлопчыкі і дзяўчынкі будуць жывіцца цікавымі ведамі. А іх любячыя бацькі тут знойдуць падказкі, чым заняць малых, як ім падаць пэўную інфармацыю, развіць здольнасці і пры гэтым прыемна і з карысцю правесці час. Мы не шукаем адказаў на пытанні, як вырасціць вундэркіндаў. На нашу думку, развіваць — не значыць навучыць як мага раней чытаць і лічыць, хоць і без гэтага не абыдзецца. Галоўнае — падтрымаць у дзіцяці яго чароўную дадзеную прыродай здольнасць — цікаўнасць і працу да адкрыцця новага.**

**У кожнага з нас свой унікальны вопыт, і шкада, што, калі малеча падрастае, мы пакрысе забываемся на ўсе здабыткі, адкрыцці, гульні. А яны яшчэ і тым каштоўныя, што тварыць нам дапамагаюць нашы сыночкі-дочкі, яны і эксперты, і суаўтары ідэй. Давайце дзяліцца досведам, вучыцца адзін у аднаго і разам расціць кемлівых малых.**

# СНЕЖНЫЯ ЎРОКІ

**Сапраўды, вучыцца можна не толькі па кніжках. Для развіцця дзіцяці можна выкарыстоўваць што заўгодна, у тым ліку... снег. Пры яго дапамозе можна нават пазаймацца літаратурай, матэматыкай, пісьмом. Але сёння на нашых уроках мы больш будзем вучыцца звяртаць увагу на дробязі, выдумляць і ствараць.**

**Маляванне.** Занесеная снегам дзіцячая пляцоўка — чым не выдатнае палатно для малявання. Пры дапамозе палачак, лапатак можна на снезе выводзіць літаркі і лічбы, геаметрычныя фігуры. Стварайце малюнкі пры дапамозе слядоў і адбіткаў далонек. Рабіце гэта разам. Напрыклад, давайце малечы простыя заданні: няхай дадасць намаляванаму тварыку роцік, вочкі, валасы, а можа ён надзене снежнаму чалавечку шапачку і рукавічкі, каб той не замёрз? Можаце палічыць, колькі малюнкаў вы зрабілі. Звярнуць увагу, якія з іх змешчаны злева, справа, зверху, пасярэдзіне. Якія яскравыя малюнкі? Захапіце на вуліцу фарбы — і ўпрыгожвайце снежныя фігуры.

**Лепка.** Са снегу можна ляпіць не толькі бабу, але і розных звяроў, казачных персанажаў. Я са сваімі малымі замахнулася нават на снежнага тыраназаўра і кракадзіла. Паверце, ствараць са снегу куды цікавей, чым з пластыліну. Варта толькі прыхапіць з сабой лапаткі. Парайцеся з дзіцем, што выкарыстаць, каб зрабіць вылепленаму са снегу коціку вусы. Няхай само дадумаецца, што гэта могуць быць галінкі ці высахлыя травінкі. А можна яшчэ дома спытацца ў дзіцяці, якую снежную скульптуру яно хацела б зрабіць і як яе ўпрыгожыць. Ці спатрэбіцца вам абгорткі ад цукерак і гузікі, банцікі, шалікі? Прапануйце адну ідэю і дайце праявіць сябе малому. Я сама не дадумалася б, што на вуліцы можа спатрэбіцца каробка ад торта, а сын выкарыстоўваў яе, каб рабіць цаглінкі і з іх складаць замак. Вы захапілі з сабой на вуліцу цацкі, з якімі летам малыя гулялі ў пясочніцы? Вядзёркі і формачкі таксама спатрэбіцца, каб ляпіць са снегу, а машынкі (грузавікі і трактары) могуць стаць тэхнікай для ўборкі снегу.

Калі на двары шчыруе цэлая армія маленькіх архітэктараў, чаму б не падбухторыць іх на стварэнне снежнага гарадка? Паспрабуйце задзейнічаць турнік ці дзіцячую горку — і ў крэпасці будзе дах.

**Літаратура.** «Спякла бабка калабка...» Снег дапаможа вам стварыць казку. Зляпіце печку, на лапаце пасадзіце ў яе снежнага калабка. Можна зляпіць са снегу ўсіх персанажаў (ці прыхапіць з сабой з дому адпаведныя цацкі). У кніжках ваша дзіця заўсёды бачыць на малюнках калабка летам, а што зменіцца ў казцы, калі ўсе падзеі разварочваюцца зімой? Якія казкі яшчэ можна вылепіць са снегу? Магчыма, вы прыдумаеце сваю.

**Чалавек і свет.** Паназірайце за слядамі. Якая птушка ці звярок маглі іх пакінуць, адкуль ці куды яны вядуць. І прыхапіце снег у вядзерцы дадому. Няхай малы сам зробіць выснову, у што той ператварыўся. А што будзе, калі гэтую ваду заліць у формачкі і паставіць у лядоўню?..

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ**



■ Пясочніца

### ЧАКАЙ ПЯТРА...

Сярожу пачаставалі цукеркамі. Маці кажа:

— Сынок, скажы, цёці «дзякуй».

Той «не чуе» — з апетытам есць. Тады маці яшчэ раз:

— Дык што трэба сказаць, Сярожа?

— Вырасту — тады скажу!



Фота Алы ЖУР.

### І ГЭТА — НЕ АНЕКДОТ

Дзядзька Міша прыехаў з горада, хоча даць гасцінцаў трохгадоваму пляменніку, але ж папярэдне пытае:

— Сярожа, а ці ясі ты шакаладныя цукеркі?

— Не, — уздыхае хлопчык.

— А чаму? — здзіўляецца дзядзька.

— Бо ў мяне іх няма.

### ЧЫСТАСАРДЭЧНАЕ ПРЫЗНАННЕ

Двухгадоваму сынку мама расказала казку пра курачку Рабу. Вырашыла праверыць, ці запомніў. Спытала:

— Сярожа, хто разбіў яечка?

Той наморшчыў лобік, падумаў і з гонарам адказаў:

— Я.

*(Маці і сапраўды на снеданне давала яму варанае яйка.)*

### РАДНЯ

Баба Надзя, размаўляючы з суседкай, расказвае ёй, што свайго сына Вову нарадзіла вясной, Славіка — летам...

— А дзеда калі? — пытае ў яе чатырохгадовы ўнук. Бо дзед жа таксама родны!

### ХТО КУДЫ

З горада прыехалі дзеці, унукі. Дзядуля з гэтай нагоды выцепліў лазню. Пяцігадовая Маруся з пераможным крыкам урываецца ў хату:

— Лазня гатовая, ідзем на памыйку!

**Запісала Дзіна ДУБАДЗЕЛАВА,**
*в. Леніна, Добрушскі раён.*

«ДЗІЦЯ МОЖА НАВУЧЫЦЬ ДАРОСЛАГА ТРОМ РЭЧАМ — РАДАВАЦЦА БЕЗ ПРЫЧЫНЫ, ЗАЎСЁДЫ ЗНАХОДЗІЦЬ САБЕ ЗАНЯТАК І НАСТОЙВАЦЬ НА СВАІМ». Паўла КАЭЛЬЁ

Адказная за выпуск Надзея ДРЫЛА.

■ Замкі Беларусі

# ПЕРАМОГА ПАД ЗОРНЫМ НЕБАМ

## аказалася настолькі важнай, што яе ўвекавечылі ў выяве герба

**«А каб табе камяні ўсё жыццё на Крэўскі замак насіць», — як ні дзіўна, такі праклён бытуе ў мястэчку Крэва і сёння: ці то прыдумаў яго дасціпны сучаснік, ці то сапраўды захаваўся ён з даўніх часоў. Старажытную пабудову рабілі ў далёкім XIV стагоддзі; ніякіх машын тады, натуральна, не было, таму і даводзілася жыхарам навакольных мясцін уручную насіць цяжкія камяні... І гэта толькі адзін з радкоў адметнай замкавай гісторыі. Шмат іншых цікавінак можна знайсці ў новай кнізе Анатоля Бутэвіча «Таямніцы Крэўскага замка», што нядаўна пабачыла свет у Выдавецкім доме «Звязда». Дарэчы, выданне кніг пра беларускія замкі ўжо стала добрай супольнай традыцыяй пісьменніка і Выдавецкага дома. Раней ужо былі выдадзены «Таямніцы Нясвіжскага замка» і «Таямніцы Мірскага замка», якія аказаліся вельмі запатрабаванымі ў чытачоў.**

Што ж за таямніцы схаваныя ў новай кнізе? Пра гэта расказаў сам **пісьменнік Анатоль БУТЭВІЧ:**

— Вакол Крэўскага замка вельмі шмат таямніц, і не толькі гістарычных. Нават напісаць гісторыю самога замка было надзвычай складана. Бо не захавалася ні даты заснавання горада, ні часу пабудовы замка, ні апісання таго, як гэта адбывалася. Нават герб — пэўная таямніца, якую яшчэ давядзецца разгадаць. Даследчыкі кажуць, што на ім выяўлены сімвал перамогі над ворагам, якая была здабыта менавіта ноччу, пры ззянні зорак і месяца. Што гэта была за перамога, якая нават стала сімвалам горада?..



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Да нашага часу замак дайшоў не ў найлепшым выглядзе. Але дзве вежы, якія былі ў ім, захаваліся. Адзін з самых цікавых часоў свайго існавання замак перажыў не ў глыбокай старажытнасці, а ў 1914 годзе, калі на гэтыя землі прыйшлі нямецкія войскі і горад аказаўся падзеленым на дзве часткі. На адной з вежаў немцы нават пабудавалі дот (на шчасце, не на той, якая ад самага пачатку называлася «княжацкай», або «кейстутавай»)...

Шмат цікавага ў кнізе знойдуць ахвотнікі прыадкрыць таямніцу шлюбаў яго ўладальнікаў. На шляхах гісторыі і аўтарскай думкі ўзважана падпісанне Крэўскай уніі. Асаблівую цікавасць, пэўна, выклічуць раздзелы «Прынцып даміно», «Быць беларусам? Быць!», «Смаргонь і Радзівілы».

Пра тое, што замкі займаюць і павінны займаць надзвычай шаноўнае месца, на прэзентацыі выдання, паразважаў **намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Алесь СУША:**

— Што такое замкі для Беларусі? Чаму яны настолькі нас зачаравалі, што мы нават стварылі дзяржаўную праграму «Замкі Беларусі», пачынаем выдаткоўваць сродкі на рэстаўрацыю, хоць разумеем, што сваю асноўную функцыю замкі страцілі некалькі стагоддзяў таму? Значыць, сёння яны патрэбны для нечага іншага... Замкі для нас — гэта найперш сімвал мінулага. На ўсход і на поўнач ад Беларусі такіх збудаванняў амаль не было. А нас нават называлі «краінай замкаў». Прычым казалі так не хто-небудзь, а шведы — досыць ваяўнічы народ. Дарэчы, у сябе яны замкаў амаль не мелі, праўда, на іх тэрыторыі вайсковыя канфлікты не праходзілі, таму не было такой патрэбы. Акрамя таго, замкі для нас — сімвалы перамог, мужнага супрацьстаяння варожай навале. Тая ж Брэсцкая крэпасць, Бабруйская крэпасць — таксама замкі. Нездарма беларускія землі сталі той мяжой, праз якую не змагла прабіцца крыжацкая навала... Замкі для нас — гэта сімвалы шматаблічнасці і шматкультурнасці нашай зямлі: там развіваліся прыдворная, магнацкая, рыцарская, куртуазная, гарадская і многія іншыя традыцыі.

Варта дадаць, што гэта выданне багата ілюстраванае. Маляўнічыя пейзажы, фотаздымкі асаблівасцяў архітэктурнай пабудовы, драматычныя палотны мастакоў — усё гэта дапаможа атрымаць ад чытання яшчэ большую асалоду.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.** *nina@zviazda.by*

■ Побач

# ВЕТЭРАНАЎ НЕ ЗАБЫВАЮЦЬ

**Уладзімір ДАРАШЭВІЧ аддаў службе ў міліцыі 25 гадоў, але і цяпер, на пенсіі, надае праваахоўнікам шмат увагі. Ён — старшыня Мінскага абласнога савета ветэранаў органаў унутраных спраў і войскаў. На яго стале, як кажуць, творчы беспарадак. Тут і там ляжаць кнігі, дакументы, у стос акуратна складзены адмысловыя пасведчанні, якія заўтра, на пашыранай нарадзе, трэба будзе ўручыць заслужаным міліцыянерам.**

***— Уладзімір Мікалаевіч, па працы даволі часта прыходзіцца сустракацца з ветэранамі-міліцыянерамі. І многіх з іх іначай як скарбніцай ведаў не назавеш.***

— І ў нашым савеце таксама шмат заслужаных і самаадданых міліцыянераў, пра якіх расказваць трэба, — кажа наш суразмоўца, бярэ ў рукі каляровыя граматы са здымкамі, якія хутка знойдуць свая ўладальнікаў, і спыняецца на адной з выяў. — Паглядзіце. Гэта **Канстанцін Трухан**. Камунікабельны, добразычлівы чалавек. Сапраўдная легенда! Працаваў нампалітам у Пухавічах. Быў дэпутатам Вярхоўнага Савета, пабудаваў у Мар'інай Горцы аддзел міліцыі. А вось **Мікалай Высоцкі і Аляксандр Грамыка** — нашы міліцэйскія пісьменнікі. Яны па крупінках збіралі гісторыю дзяржынскай і смалявіцкай міліцыі, напісалі пра яе шэраг кніг. Сяргей Верас — наш інтэлектуал, самародак. Між іншым, узначальвае ветэранскую арганізацыю ўпраўлення аховы грамадскай бяспекі.

Многія ведаюць **Кастуся Цыбульскага**, вядомага паэта-песенніка, цудоўнага спевака. Ён напісаў гімны беларускай міліцыі, ветэранскай арганізацыі, чыгункі і дзясяткі, калі не сотні, твораў, прысвечаных нашым праваахоўнікам. **Сяргей Чарніцкі**. У свой час ён быў камандзірам дывізіёна дарожна-патрульнай службы Мінскай вобласці, у якой на той момант была самая складаная абстаноўка ў



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

рэспубліцы па дарожна-транспартных здарэннях. Добры чалавек. Усіх любіць. У жыцці нават муху не пакрыўдзіў. Не магу не адзначыць і старшыню **Паўла Сівакова**, які актыўна дапамагаў узводзіць цяперашні будынак міліцыі ў Салігорску. Але гэта не самае галоўнае. Ён, рызыкуючы жыццём, вырátаваў на вадзе пяцярых чалавек ад смерці. Сярод іх трое дзетак. У салігорскім аддзеле экспертам-крыміналістам працавала **Юзэфа Банасевіч**. З-за працы яна ахвярвала асабістым жыццём. Гады прайшлі, а яна так і не пабралася шлюбам. Ведаеце, для любога чалавека галоўнае — ўвага. Тым больш, калі ён у паважаным узросце. Кожнаму прыемна, калі яго наведваюць, своечасова віншуюць. УУС Мінаблвыканкама ўзначальваюць вельмі добрыя кіраўнікі. Людзі чулліва ставяцца да пенсіянераў. І мне часам падаецца, што генерал-маёр **Ігар Яўсееў**, моцная асоба і талковы начальнік, гатовы ўсё аддаць ветэранам.

***— Колькі чалавек складаюць вашу арганізацыю?***

— Прыкладна паўтары тысячы. Нашы людзі — у кожным кутку вобласці. Больш за ўсё іх у Барысаве, Салігорску, Маладзечне, Слуцку, Мінскім раёне... Як можам, стараемся ім дапамагаць. Гэта найперш сацыяльная падтрымка: маральная і матэрыяльная. Вось вам прыклад. **Люцыян Браніслававіч Сабалеўскі**, былы начальнік упраўлення ўнутраных спраў Мінаблвыканкама, на жаль, не можа хадзіць — ляжачы. Пэўны час ён быў маім кіраўніком. І калі я да яго прыйшоў, ён літаральна на вачах ачуняў, наколькі гэта магчыма. Увага сапраўды робіць многае. Мы насамрэч амаль кожны тыдзень кагосьці наведваем. Акрамя таго, часта праводзім вечары-партрэты: прысвячаем пэўнаму чалавеку праграму ў нашым клубе, запрашаем яго разам са сваякамі, ветэранамі, з дапамогай нашага аддзялення інфармацыі і грамадскіх сувязяў робім відэафільмы, уручаем падарункі, у нас выступаюць артысты. Мы таксама часта наведваем знакамітыя беларускія мясціны. Мінулай восенню былі ў Жыровіцкім манастыры.

***— Праца ў міліцыянераў складаная. У многіх здароўе забірае...***

— Так. Мой першы начальнік **Дзмітрый Арцімовіч** пражыў усяго 58 гадоў, **Аляксандр Крукаў**, былы начальнік крымінальнага вышуку ўпраўлення ўнутраных спраў Мінаблвыканкама, — 61 год. **Валерыю Свірыдаву**, з якім мы пачыналі службу, і пяцідзесяці не было, калі памёр. Рана пакінуў нас Жорж Ісакаў, які ўзначальваў следчы аддзел упраўлення ўнутраных спраў Мінаблвыканкама. Большасць з іх — інфарктнікі, доўга не пражылі. Самаадданыя людзі. Яны аддалі службе сваё жыццё.

***— Устаноўка барэльефа генерала Генадзя Пукава на першым паверсе будынка ўпраўлення ўнутраных спраў Мінаблвыканкама — таксама ініцыятыва ветэранскай арганізацыі?***

— Я не хачу выхваляцца, але ягонае «ўваскрашэнне» — гэта і мая ініцыятыва. Шкада, але пра гэтага заслужанага чалавека ў нас нeяк забыліся. Між іншым, менавіта ён накіраваў мяне, маладога лейтэнанта, працаваць следчым у Салігорск. Я пачаў аб ім пісаць у прэсе, пасля пра яго выдалі кнігу ўспамінаў. Сярод іншага пісаў аб тым, каб у міліцыі Міншчыны для найбольш талковых кіраўнікоў увялі прыз у гонар Пукава, стваральніка нашай рэспубліканскай ветэранскай арганізацыі, якая сёлета адзначыць 25-гадовы юбілей. Гэту ўзнагароду зацвердзілі. Ну а пасля і барэльеф з'явіўся, безумоўна, пры падтрымцы нашай ветэранскай арганізацыі.

***— У вас на працоўным стале — сапраўдная творчая атмасфера. Да чаго рыхтуецеся зараз?***

— Заўтра адбудзецца пашыраная нарада абласнога савета ветэранаў, пасля наведаем музей Вялікай Айчыннай вайны. На нараду запрасілі ў тым ліку ўсіх кіраўнікоў першасных арганізацый з усёй Міншчыны, збіраем усіх актывістаў, узнагародзім за адданую службу. Мы таксама запрасілі **Мікалая Чаргінца**, старшыню Саюза пісьменнікаў Беларусі, журналістаў. Што цікава, у мяне ў самога журналісцкая генетыка. Мой бацька быў журналістам і пачаў працаваць у 16 гадоў у газеце «Сталінец» аж у 1940-м. Усё ж такі хочацца, каб сродкі масавай інфармацыі больш увагі ўдзялялі міліцыянерам, іх цяжкай працы, і не забывалі пра нашых ветэранаў. Яны сапраўды таго вартыя.

**Тарас ШЧЫРЫ.** *taras@zviazda.by*

■ Экслібрыс «Звязды»

# ПОВЯЗЬ ТВОРЧЫХ АДКРЫЦЦЯЎ

**Повязь: апавяданні, навелы / укладальнікі Іван Саверчанка, Георгій Марчук. — Мінск: Мастацкая літаратура, 2015. — 398 с.**




Амаль тры дзясяткі творцаў, блізу паўсотні тэкстаў — і некалькі гадзін адкрыццяў, сустрэч, перажыванняў. Думаецца, творчасць многіх празаікаў з гэтай кнігі ўжо добра знаёмая чытачам. Так, Віктара Гардзея мы ведаем як глыбокага лірыка і выдатнага дзіцячага пісьменніка, Юлію Зарэцкую любім як таленавітага аўтара гумарыстычных апавяданняў, чыталі п'есы ды казкі Георгія Марчука, знаёміліся з таленавітымі інтэрв'ю Зіновія Прыгодзіча, перажывалі за лёс герояў псіхалагічнай прозы Уладзіміра Саламахі... Кожны з творцаў, чые апавяданні прадстаўлены ў гэтай кнізе, — ужо зорка, але сабраныя пад адной вокладкай, у адным сузор'і, іх імёны нібыта заззялі новым, непаўторым, а часам і нечаканым святлом.

Напрыклад, паэт Віктар Гардзей паўстае ў ролі празаіка. Ён таленавіта вядзе аповед «Над ракою Ведзьмай», пераносіць чытача ў гарадок Ляхавічы часоў свайго студэнцтва і малюе дзіўную для сучаснай моладзі, але настальгічную для іх бацькоў карціну танцаў у парку, на адмысловай танцпляцоўцы. Пагадзіцеся, такія вечарыны, ды і самі танцпляцоўкі, — амаль артэфакт мінулага часу. Увага аўтара сягае і глыбей у стагоддзі, ён пераносіць нас у далёкую мінуўшчыну, калі існавала магутная Ляхавіцкая крэпасць, знаёміць з мясцовымі страшнымі гісторыямі пра падзямеллі ды воінаў-прывідаў, якія і сёння звіняць даспехамі ў бясконцай бітве.

З выдатным пераўвасабленнем можна павіншаваць і празаіка Алега Ждана. У апавяданні «Сабачы бог» ён вядзе размову ад імя... жанчыны за сорак. Яна разведзеная, прафесію інжынера-канструктара пакінула, каб працаваць звычайным дворнікам, асабістае жыццё ніяк не наладзіцца, хоць нельга сцвярджаць, што мужчыны абыходзяць яе ўвагай. А прычынай усяму стаў... сабака Эрдэль. Яго спаралізаваныя заднія лапы, а таксама недарэчны і пакутлівы выгляд проста магічным чынам палохаюць усіх навокал. Але цуды здараюцца не толькі ў чалавечым, але і сабачым жыцці. І адбываюцца яны ў самы нечаканы момант, калі здаецца, што ўсё страчана.

Таццяна Мушынская героямі свайго лірычнага апавядання «Дыханне ранняй восені» таксама абрала мужчыну і жанчыну досыць сталага веку. Дзеці выраслі, нарадзіліся ўнукі, жонкі ці мужы памерлі. Што рабіць? Як жыць далей? Аўтарка прапануе выйсце — прайсціся сцежкамі маладосці, паспытаць новага шчасця з тымі, з кім раней не існавала магчымасці быць побач. Так, любоўная сувязь на адпачынку, якая, тым не менш, не разбурыла сем'і герояў, для іх стала навіцца сапраўдным выратаваннем і надзеяй. Гэта шанц і пабыць разам з блізкім чалавекам, і не сустракаць старасць у адзіноце.

Пра кожнае з апавяданняў, што ўвайшлі ў кнігу «Повязь», можна разважаць амаль бясконца. Для сябе я тут зазначыла некалькі імёнаў празаікаў, да чыёй творчасці буду пільна прыглядацца і надалей. Спадзяюся, і вы знойдзеце ў зборніку сапраўды любімых пісьменнікаў.

**Марына ВЕСЯЛУХА**

■ Грошы

# ЛАМБАРДАМ «РАЗВЯЗАЛІ» РУКІ

## Цяпер гэтыя мікрафінансавыя арганізацыі змогуць самастойна прадаваць незапатрабаваныя заклады коштам да 21 мільёна рублёў

**Увогуле сёлета для ламбардаў спрасцілі працэдуру спагнання і рэалізацыі закладу (рухомай маёмасці, прызначанай для асабістага, сямейнага або хатняга выкарыстання) па прадастаўленых фізічным асобам мікрапазыках. Падобныя змены былі ініцыяваны Нацыянальным банкам краіны і зацверджаны Дэкрэтам кіраўніка дзяржавы ад 21 студзеня 2016 года № 1.**



### Тэрмін «замарожвання» грошай скарацілі ўдвая

У прыватнасці, палажэннямі Дэкрэта № 1 прадугледжваецца права ламбарда самастойна накіроўваць сысканне на рухомую маёмасць, якая знаходзіцца ў яго ў закладзе па прадастаўленых фізічным асобам мікрапазыках, калі сума ацэнкі такой маёмасці не перавышае 100 базавых велічынь. Накіраванне сыскання магчымае толькі па заканчэнні месячнага тэрміну пасля наступлення дня вяртання сумы мікрапазыкі, устаноўленага дагаворам. Таксама згаданы дакумент цяпер дазваляе ламбардам самастойна рэалізоўваць гэтую маёмасць. А вось парадак працы ламбардаў з вырабамі з каштоўных металаў застаецца ранейшым.

Непасрэдна самі правілы самастойнага сыскання і самастойнай рэалізацыі ламбардамі закладаў (такой маёмасці) будуць вызначаны ўрадам і Нацыянальным банкам на працягу трох месяцаў з дня афіцыйнага апублікавання Дэкрэта № 1.

